ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЕЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Менскага гарому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня XV
№ 53 (4305)
НЯДЗЕЛЯ, 6 сакавіка
1932 г.

МЕНСК, Савецкая 63

СЕНЬНЯ У НУМАРЫ

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ — Па-баявому рыхтавацца да торфасэзону.

А. ХАЦКЕВІЧ — 2 гады шэфства заводу імя Варашылава над НКФ (2-я стар.). Ссыпка тэхкультур і браніяваньне насеньня бульбы — найбольш адсталы вучастак работы ільнаводчых і бульбяных раёнаў. Рэспубліканскі плян ільназагатовак выканан усяго на 56,5 проц. (1-я стар).

Апляціць рахункам сацыялістычных палёў — справа гонару кожнага рабочага заводу с.-г. машынабудаўніцтва. Рашуча перамагаць апартуністычныя адносіны да абарончай работы. «Брагін завёў дружбу з Марыляй і Настай»... (агляд друку). Апартуніс тычнае скажэньне лініі партыі ў Пятрыкоўшчыне (2-я стар.).

Аб арганізацыі працы ў калгасах — пастанова НКЗ і праўленьня Калгасцэнтру БССР. Раўнайцеся па 12-ым вучастку (месячнік дарбудаўніцтва). За бальшавіцкае ажыцьцяўленьне пастановы ЦК УсеКП(б) аб школе (3-я стар.).

Масавымі мітынгамі адзначылі чыгуначнікі дзень старту. Кітайскія войскі акапаліся паміж Нанкінам і Кінкінам. Апошнія весткі з фронту індустрыялізацыі (4-я стар).

Па-баявому рыхтавацца да торфсэзону

Разьвіцьцё тарфяной прамысловасьці складае адну з асноўных задач народна - гаспадарчага значэньня, якія стаяць перад КП(б)Б. Стварэньне магутнай энэргетычнай базы непасрэдна ўпіраецца ў пытаньне фарсаванай распрацоўкі тарфяных багацьцяў БССР. Вялізарнае значэньне набывае хэмічная перапрацоўка торфу.

XIV зьезд КП(б)Б яшчэ раз падкрэсьліў усю важнасьць праблемы торфу і прапанаваў «ВСНГ і ўсім гаспадарчым, прафэсыянальным, савецкім і партыйным арганізацыям паставіць у цэнтры ўвагі задачу выкананьня пляну па торфаздабычы ў 1932 г., рашучага паляпшэньня якасьці здабытага торфу і забесьпячэньня ў 1932 годзе тэхнічна - матар'яльнай базы для пераводу ў асноўным усёй прамысловасьці і энэргагаспадаркі ў 1933 годзе на тарфяны апал».

Тарфяная прамысловасьць БССР прабла за апошнія гады буйны крок наперад. Замест дробных саматужных распрацовак, што мелі месца ў мінулым, зараз ёсьць рад буйных заводаў з мэханізаваным працэсам вытворчасьці. Хапя плян торфаздабычы ў 1931 годзе застаўся і не выкананым, але размах у работах усё-ж быў дасягнут вельмі высокі. Даволі супаставіць такія два факты: з 1923 па 1930 г. было здабыта 450 тыс. тон, у прашлым-жа годзе выпрацавана торфу 690 тыс. тон. Але яшчэ больш высокія тэмпы запраектаваны для 1932 году.

Выкананьне праграмы раней за ўсё патрабуе своячасовай, усебаковай падрыхтоўкі да торфасэзону. Нельга забываць, што адной з важнейшых прычын недавыкананьня тарфяной прамысловасьцю свайго праграмнага пляну зьявілася імкнена слабая падрыхтаванасьць да пачатку работ, недапушчальная затрыжка разгортваньня торфаздабычы на большасьці заводаў.

Аднак, прыходзіцца канстатаваць, што гаспадарнікамі і партыйнымі арганізацыямі торфапрамысловасьці не зроблены ўсе належныя высновы з урокаў мінулага году. Праверка, праведзеная ЦК і ЦКК КП(б)Б, выявіла, што падрыхтоўка да торфсэзону працягваецца яўна недавальняюча.

Недапушчальна зацягнулася пытаньне ўстанаўленьня канчатковай праграмы торфаздабычы і спуск нарміндарных плянаў падрыхтоўчых работ. Гэта ў сваю чаргу тармазіць масавую працпрацоўку зацікаўленьняў і складаньне сустрэчных плянаў па асобных прадпрыемствах. Да гэтага часу канчаткова не вырашана пытаньне аб стаўкосінах у праграмах здабычы асобных відаў торфу. Буйныя шчэпкі існуючых паміж плянавымі намаганьнямі торфазаводаў і спажыўчай патрэбай прадпрыемстваў, што абслугоўваюцца імі.

Тэрміновае вырашэньне ўсіх пытаньняў, зьвязаных з плянаваньнем работы торфапрамысловасьці складае неадкладную задачу сёньняшняга дня. Белторф і ўсе арганізацыі, якія маюць адносіны да тарфяной прамысловасьці, павінны забясьпечыць своячасовае скончаньне падрыхтоўкі балот да распрацовак з такім разьлікам, каб канчатковы работы былі поўнасьцю скончаны да 15 сакавіка, і выпусьціць вчосу пад фрэзэры торф — не позьней 1 мая.

Важнейшае значэньне мае пытаньне максымальнай мэханізацыі торфаздабычы. Гэта пытаньне раней за ўсё ўпіраецца ў своячасовасьць установкі лёкамабілёў, рамонт мэханізмаў і забесьпячэньне апошніх запаснымі часткамі.

У гэтых адносінах становішча вастраецца да гэтага часу вельмі напружана. Ня зважаючы на спэцыяльную настаўку партыйных і ўрадавых органаў, экспорт лёкамабілёў, даных у часовае карыстаньне ільнопенькаабжынкаму, тармозіцца. Тут мае месца пагрыбаньне справы з чыста ведамственага пункту погляду. У радзе выпадкаў нагадваюцца факты пакаданьня зварочаць нават тыя лёкамабілі, якія не знаходзяцца ў экспляатацыі. Падобнае зьявішча проста абураючае і абсалютна недапушчальнае.

Трэба рашуча пакласьці канец цягаціне са зваротам лёкамабілёў. Усялякае затрыманьне можа падагнаць самыя адмоўныя вынікі для разгортваньня торфаздабычы. Пастановы партыі і ўраду па гэтым пытаньні павінны быць неадкладна і безагаворачна выкананы.

Заводы, якія вырабляюць запасныя часткі для абсталяваньня торфазаводаў (імя Варашылава, «Чырвоны барацьбіт») абавязаны ў тэрмін выканаць ганьня ім заказы. Рамонту мэханізмаў трэба аддаць значна больш увагі, узяць тут ударныя тэмпы.

Пасьпяховае выкананьне задач, што стаяць перад торфапрамысловасьцю, цэнтралізавана зьвязана з далейшай мэханізацыяй транспартаваньня торфу. Недахопы ў рабоце па вывазцы торфу вялікім цяжарам ляглі ў гэту зіму на рад прадпрыемстваў, парадзілі шмат шкодных простояў. Пакольку неадкладваньняча стаіць справа з мэханізацыяй вывазкі торфу можна мераваць хапя-б па тым, што на адным з самых буйнейшых торфазаводаў БССР — на «Асіпторфе» плян пракладкі чыгуначнага шляху выкананы толькі на 37 проц., паравозы і вагоны парка з-за абазьлічкі знаходзяцца ў сваім нездавальняючым стане, нагрузочныя машыны адсутнічаюць. Барацьба за мэханізацыю транспартаваньня торфу павінна быць пастаўлена за ўсю шырыню.

Адначасова, максымум увагі неабходна аддаць вывазцы торфу гужавым спосабам. Тэмпы вывазкі застаюцца надзвычай нізкімі. На 25 лютага квартальны плян вывазкі выкананы усяго толькі на 43,5 проц. Гэта стварае ня толькі затрудненьні для прадпрыемстваў у сапале, але і сурёзна пагражае выкананьню праграмы новага торфсэзону, г. зн. шалі сьцілкі застаюцца запытымі старым торфам.

Арганізаваны набор рабочай сілы вылучэньня адным з стрыжнёвых пытаньняў падрыхтоўкі да торфасэзону. Аднак, і тут зроблена яшчэ вельмі мала. З неабходных 13.790 чалавек, завербавана толькі 4.739 чал., г. зн. 36 проц., прычым калгасныя складаюць толькі 14 проц. Арганізацыйна-масавай работы вакол вярбоўкі амаль не вядзецца. Заключаны калгасамі часта канкротныя, ня ўключаюць у сябе канкротных абавязацельстваў абодвух бакоў. Увага вярбоўцы павінна быць рашуча ўзмоцнена. Нельга абмяжоўвацца з наўтарэньнем леташняй практычнай рабочай сілы, яе недахопам на асноўных торфараспрацоўках.

У гэтай-жа сувязі трэба паставіць пытаньне аб паляпшэньні матар'яльна - бытавога абслугоўваньня тарфянікаў. Фарсаванае вырашэньне бытаўніцтва, разгортваньне культурна-бытавых установаў, паляпшэньне работы тарфяной кампаніі — усё гота ў вялікай ступені абумоўлівае посьпех торфсэзону.

Адказныя задачы, якія стаяць перад тарфяной прамысловасьцю, уладзіра патрабуюць рашучага паляпшэньня апэрацыйнага кіраўніцтва ўсімі звяньнямі гэтай галіны народнай гаспадаркі, бальшавіцкага ажыцьцяўленьня тут б умоў т. Сталіна. Перад гаспадарчымі, партыйнымі і профсаюзнымі арганізацыямі паўстае з усёй вострасьцю задача ўзмацніць кантроль ўсёй сваёй работы, канкрэтызацыі штодзённага кіраўніцтва. Абураючыя недахопы ў рабоце канкрэтных арганізацый, якія мелі месца ў сыстэме Белторфу ў мінулым годзе, не павінны больш паўтарацца. Кроўі, прадпрынятыя ў галіне разбуйненьня торфапрамысловасьці, перапачы раду торфазаводаў непасрэдна спакушэньнем і органам мясцовай прамысловасьці ствараюць спрыяючую абстаноўку для перабудовы работы.

Змагаючыся з апартуністычным тармажэньнем тэмпаў, на аснове канкротнага апэрацыйнага кіраўніцтва разгортваючы метады камуністычнай працы, торфяная прамысловасьць зможа сустрэць торфсэзон на ўсёўзброеньні, і, выкананьнем свайго прамфінпляну створыць магутную апалавую базу для народнай гаспадаркі БССР.

Усебеларускі сталінскі паход фабрычна-заводзкага друку

За штодзённае апэрацыйнае кіраўніцтва

БАРЫСАЎ. (Па тэлефону). З сакавіка адбыўся чарговае пасяджэньне гарадзкога штабу кіраўніцтва сталінскім паходам. На пасяджэньні заслуханы інфармацыі аб рабоце па сталінскім паходзе рэдакцый шматтыражак і фабкомаў камбінату «Камінтэрн» і гуты імя Домбаля. На камбінаце «Камінтэрн» сталінскі паход-сабатніцтва нізавога друку, пад непасрэдным кіраўніцтвам заводзкай партарганізацыі, ператвараецца ў лепшы сродак барацьбы ўсіх рабочых камбінату за выкананьне прамфінпляну на аснове рэалізацыі 6 умоў тав. Сталіна, за ўкараненьне гаспадарчага разрахунку і аўладаньне тэхнікай.

На пасяджэньні гарадзкога штабу была асабліва падкрэслена важнасьць перанясеньня вопыту агляду-самаправеркі гаспадарча-разрахунковых брыгад, які праводзіцца зараз шматтыражкай «Ударнік» і фабкомам камбінату на ўсіх прадпрыемствах Барысава. Агляд—самаправерка гаспадарча - разрахунковых прадпрыемствах Барысава. Агляд-вых і ўдарных бригад адбываецца побач з арганізацыяй новых гаспадарча-разрахунковых брыгад. За час праведзеньня сталінскага паходу па камбінаце арганізаваны 22 новыя ўдарныя брыгады, з якіх 12 працуе на гаспадарчым разрахунку. Уся ўвага партыйнай, профсаюзнай арганізацыі і нізавога друку камбінату зараз зьвернута на паляпшэньне якасьці работы гаспадарча-разрахунковых брыгад, поўнага выкананьня імі дагавораў.

Адначасова гарадзкім штабам пакінуты шматтыражцы і фабкому камбінату на невыстарчальную работу на камбінаце па ліквідацыі абзьлічкі варштатаў і ўраўніўцаўкі, што тармозіць поўнае выкананьне прамфінпляну.

Дрэнна стаіць справа з разгортваньнем сталінскага паходу на гуце імя Дом баля. Партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі гуты да гэтага часу яшчэ ня ўключыліся ў яго праведзеньне. Рабкоры і рабочыя гуты не азнаёмлены нават з умовамі сталінскага паходу. Гарадзкі штаб кіраўніцтва паходам прапанаваў заводзкім арганізацыям гуты імя Домбаля зараз-жа разгарнуць работу па праведзеньні сталінскага паходу. У дапамогу ў гэтай рабоце рэдакцыя «Бальшавіка Барысаўшчыны» выпусьціла аднаго работніка для пастаяннай работы на гуце па сталінскім паходзе. Штабам вызначаны кандыдаты на права рапартаваць VII усебеларускаму зьезду прафсаюзаў—шматтыражкі «Чырвоны Бярэзінец», «Гута» і «Ударнік». Гэтыя шматтыражкі вылучаюць для рапарту таксама і лепшыя насьцягаэты сваіх прадпрыемстваў. Вызначаныя шматтыражкі пачынаюць паміж сабой спаборніцтва за права рапартаваць усебеларускаму зьезду прафсаюзаў.

Рапартаваць будуць шматтыражкі, якія даб'юцца на сваім прадпрыемстве, у цэхах і брыгадах найлепшай работы па рэалізацыі 6 умоў тав. Сталіна, якія пад кіраўніцтвам партарганізацыі мабілізуюць рабочых свайго прадпрыемства на выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну першага кварталу.

БЯЛЬКО, НЭДЛІН.

ССЫПКА ТЭХКУЛЬТУР І БРАНІЯВАНЬНЕ НАСЕНЬНЯ БУЛЬБЫ—

найбольш адсталы вучастак работы ільнаводчых і бульбяных раёнаў

ЧЫРВОНАЯ ДОШКА

Скончылі збор насеньня

Чэрвеньскі раён: Калгасы „Ніўны бор", „Важаты", „Чырвоная спабада" імя Фрунзэ, „Перамога" і імя Энгельса

Койданаўскі раён: Калгас імя Тэльмана.

Слуцкі раён: Калгас „Камбайн"

Прырост толькі на 1,9 проц.

Апошняя пяцідневка на 1 сакавіка ня дала колькі-небудзь значнага зруху. Плян засыпкі насенных фондаў усіх культур выкананы на 53,3 проц., — прырост пераўважна з мінулай пяцідневкай — 1,9 проц. У тым ліку засыпана тэхкультур — 40,4 проц., бульбы — 53,2 проц. Ачышчана толькі 22,6 проц.

На фоне вялікага алтаваньня па засыпцы насеньня, злачынныя зьяўляюцца адносіны некаторых раёнаў да справаздачнасьці. Вучот наяўнасьці і засыпкі фондаў усё яшчэ не наладжан, няма належнага кантролю з боку раённых арганізацый за работай сельсаветаў у гэтай галіне. Даволі прывесьці той факт, што на 1 сакавіка далі весткі НКЗБ толькі чатыры раёны: Чэрвяўскі, Крычаўскі, Пятрыкоўскі і Хойніцкі. Іншыя раёны, пачынаючы з 20 лютага ня лічаць сваім абавязкам даваць весткі. Асабліва злачынныя адносіны праяўляюць да вучоту Буда-Кашалёўскі і Шклоўскі раёны, якія з 10 лютага ўпарта маўчаць. Пачынаючы з 15 лютага ня прыслалі зводак Асьвейскі, Лёзьнянскі, Бешанковіцкі, Расонскі, Сенненскі, Талочынскі, Чавускі, Вушацкі раёны.

Асаблівую трывогу выклікае ход збору насеньня асноўных культур у спэцыялізаваных раёнах. Па ільнасалочных раёнах плян сеяльных збожжавых выкананы на 59,8 проц., а па тэхкультурах нават ніжэй сярэдняга рэспубліканскага, — ссыпана ўсяго 35,8 проц.

Па бульбяна-жывёлагадоўчых раёнах збожжавых засыпана 59,3 проц., а па бульбе 50 проц. Гэтыя факты паказваюць, што ва многіх раёнах яшчэ не пераключыліся на баявыя тэмпы збору насеньня пазугул і асабліва тых культур, якія зьяўляюцца вядучымі.

Ня глядзячы на такое становішча са зборам насеньня, мы маем факты разбазарваньня як збожжавых культур, так асабліва бульбы. Належнай барацьбы з разбазарваньнем у радзе раёнаў не вядзецца. У некаторых калгасах усё яшчэ выдаюць авансы тым калгаснікам, якія належачую ім частку ўраджаю цалкам атрымалі. Канчатковае разьмеркаваньне даходаў і канчатковы падлік атрыманага калгаснікамі ўраджаю ў значнай частцы калгасаў яшчэ скончаны.

Разрыў паміж плянамі ссыпкі і ачысткі насеньня сьведчыць аб тым, што збожжаачышчальныя машыны не нагружаны, што вакол гэтага важнейшага аграмерапрыемства не разгорнута належная масавая работа. Часта машыны працуюць замест дзьвёх зьмен у суткі, толькі адну. Яшчэ горшыя факты мы маем у Дубровенскім раёне, дзе на складах Белсельснабу стаіць 21 збожжаачышчальная машына без работы. У гэтым жа раёне ў калгасе імя БедДРЭС зусім не скарыстоўваецца сартоўка «Трыумф». У Віцебскім раёне ў саўгасе Доўжа стаіць трыер і сартоўка. Такія-ж факты мы маем у некаторых іншых раёнах. Як відаць, барацьба за захаваньне і якасьць насеньня яшчэ ня стала ў цэнтр увагі раённых арганізацый.

Неабходна адзначыць, што ў радзе месц усё яшчэ праяўляюцца апартуністычныя адносіны да арганізацыі пасталянных вытворчых брыгад у калгасах. Палітычнае значэньне, брыгады, як асноўнага звяна ў арганізацыі працы там недаацэньваецца. Апошнія пастановы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб мерапрыемствах па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў ня ўсюды атрымалі практычнае праламленьне.

Да пачатку палявых работ засталіся лічаныя дні. Тэмпы ссыпкі насенфондаў павінны быць значна ўзмоцнены. Апартуністычнай практыцы і недаацэнцы збору насеньня, як цэнтральнай задачы ў падрыхтоўчай рабоце да весны павінен быць нанесен зьнішчальны ўдар. Да 10 сакавіка ссыпка насенных фондаў павінна быць скончана. Ільнаводчыя і бульбяныя раёны павінны зьвярнуць асаблівую ўвагу на забесьпячэньні насеньнем плошчаў, вызначаных пад пасеў тэхкультур і бульбы.

Калгасная брыгада праверыла насенны фонд

КОЙДАНАВА.

Калгас імя Тэльмана першы ў Койданаўскім раёне ўключыўся ў праверку ссыпкі насенных фондаў, абвешчаную ЦКК-НК РСІ.

Для праверкі калгас стварыў спэцыяльную брыгаду, якая праверыла колькасьць наяўнага насеньня, яго якасьць і захаваньне.

Калгас сёлета будзе сеяць: 80 гэкт. аўса, 90 гэкт. бульбы, 50 гэкт. ячменю, 10 гэкт. пшаніцы, 33 гэкт. сэрадэлы, 10 гэкт. вікі і інш. культуры.

Уся гэта плошча поўнасьцю забясьпечана належным насеньнем. Аўса ёсьць 160 цит., бульбы—1.350 цит., ячменю—60 цит., вікі—10 цит, пшаніцы—15 цит. Стварылі фонд ссыпан у разьмеры 15 проц. насенфонду.

Насеньне пшаніцы, ячменю, гароху і часткі аўса ўжо ачышчана. На працягу 2-3 дзён ачыстка ўсяго насеньня будзе скончана.

Вылучан член праўленьня, які адказвае за захаваньне насенфонду. У распараджэньне гэтага члена праўленьня вылучана брыгада калгаснікаў, якая будзе займацца сухім пратручваньнем насеньня. Брыгада абавязалася поўнасьцю скончыць пратручваньне яго сухім спосабам да 1 красавіка. Такое мерапрыемства, як сухое пратручваньне, павышае ўраджайнасьць, дае магчымасьць бесьперабойна ўвесь час сеяць, не чакаючы пакуль прасохне насеньне, як гэта бывае пры мокрым пратручваньні.

З тэй прычыны, што ў мінулым годзе ўраджай ільну быў пазьдзячай нізкім, калгас не забясьпечан насеньнем ільну, якога яму не хапае 5 цит. Але ў калгасе ёсьць ліпкі насеньня любіну, а таму калгас парашыў арганізаваць сацыялістычную насенную пазыку і першым уносіць унёсак насеньня любіну ў колькасьці 10 цит.

Калгас імя Тэльмана зьвярнуўся праз раённую газету да ўсіх калгасаў раёну аб стварэньні сацыялістычнай пазыкі насеньня для дапамогі тым калгасам, у якіх адчуваецца недахват яго.

Калгас ідзе ў авангардзе і па іншых вучастках падрыхтоўкі да веснавой сяўбы. Рамонт інвэнтару і вупражы скончан. Коні калгасу прымацаваны да пасталянных работнікаў. Даглядае коней пасталянная брыгада конюхоў.

Брыгада «Зьвязды»:
Чыкун, Булай, Каваленка.

Зводка аб ходзе засыпкі насенных страхавых фондаў і ачысткі насеньня

ў процантах па раёнах БССР на 1-га сакавіка 1932 г.

РАЁНЫ	Ссыпка насенфондаў у процентах да плану	Ссыпка страхавых фондаў у процентах да плану	Ачышчана насеньня у процентах да плану
1	2	3	4
1. Асьвейскі	34,6	34,6	—
2. Бешанковіцкі	49,6	33,7	21,2
3. Бялыніцкі	53,2	—	11,2
4. Вушацкі	12,6	27,1	22,1
5. Горацкі	49,3	37,5	39,1
6. Гарадоцкі	32,3	24,3	15,2
7. Дрысенскі	37,5	21,3	26,3
8. Дубровенскі	76,0	53,2	49,4
9. Крупскі	44,5	4,8	—
10. Лепельскі	90,4	52,1	43,4
11. Лёзьнянскі	76,0	34,7	65,8
12. Мсьціслаўскі	97,5	33,6	27,2
13. Полацкі	40,9	55,1	26,2
14. Расонскі	67,9	5,4	9,8
15. Сенненскі	99,9	21,1	45,9
16. Сіроцінскі	52,4	10,8	60,3
17. Сураскі	56,7	34,6	25,3
18. Талочынскі	23,3	17,2	—
19. Чашніцкі	60,0	20,7	13,4
20. Чавускі	53,7	67,1	20,1
21. Шклоўскі	73,6	89,0	43,5
22. Асіпаніцкі	63,6	31,8	16,7
23. Барысаўскі	47,3	18,8	15,0
24. Бягомльскі	46,6	36,2	34,9
25. Быхаўскі	53,5	18,2	32,6
26. Буда-Кашал.	56,6	26,3	20,5
27. Бярэзінскі	52,9	34,5	0,4
28. Веткаўскі	45,4	30,4	9,1
29. Вузьдзенскі	63,0	33,4	11,7
30. Жлобінскі	3,8	—	9,7
31. Заслаўскі	59,6	42,8	44,2
32. Карматскі	61,7	38	7,6
33. Касьцюковіцкі	59,8	46,5	16,1
34. Клічаўскі	66,2	28,6	42,9
35. Клічаўскі	52,2	18,5	19,7
36. Койданаўскі	55,7	40,7	31,9
37. Капыльскі	7,5	27,4	23,8
38. Крычаўскі	41,8	35,6	3,9
39. Лагойскі	53,6	28,1	13,3
40. Плешчаніцкі	62,6	55,0	44,6
41. Прапойскі	50,9	39,1	16,4
42. Пухавіцкі	70,5	21,6	17,8
43. Рагачоўскі	48,1	20,7	32,6
44. Слуцкі	51,8	13,3	22,9
45. Смалявіцкі	48,4	29,3	—
46. Стародарожскі	80,7	36,5	13,9
47. Уваравіцкі	49,7	16,7	12,3
48. Церахаўскі	36,3	16,2	14,2
49. Чачэрскі	61,8	18,9	6,0
50. Чырвонаслаб.	82,1	37,9	—
51. Чырвонапол.	65,3	36,1	50,5
52. Чэрвенскі	50,1	34,0	0,6
53. Чэрвяўскі	0,3	0,5	—
54. Брагінскі	74,6	38,4	28,9
55. Глускі	38,9	7,1	5,6
56. Ельскі	64,3	15,8	32,2
57. Жыткавіцкі	57,3	76,1	22,4
58. Камарынскі	54,1	56,2	1,7
59. Лельчыцкі	17,6	5,0	11,1
60. Лоеўскі	57,1	28,6	18,5
61. Мазырскі	67,9	15,9	10,5
62. Нараўлянскі	52,4	8,5	4,7
63. Парыцкі	31,3	7,9	0,4
64. Любаньскі	67,9	95,5	93,0
65. Пінскі	44,9	22,6	—
66. Рэчыцкі	47,1	10,1	6,3
67. Старобінскі	65,3	33,6	25,5
68. Тураўскі	53,9	57,9	15,4
69. Хойніцкі	49,6	28,3	20,2
70. Аршанскі	67,5	78,3	44,7
71. Бабруйскі	61,4	18,7	25,0
72. Віцебскі	74,3	54,7	30,4
73. Гомельскі	24,2	25,3	4,5
74. Магілёўскі	45,7	—	16,3
75. Менскі	63,7	83,1	26,3
Разам па БССР	53,3	31,3	22,6

156 калгасаў ня маюць пасеўных плянаў

ТАЛОЧЫН. (Наш спэцкор.).

Для засеву яравога клину раёну трэба зняць 32 тыс. цэнтн. насеньня. Па 20 лютага сабрана ня больш 10 тыс. цэнтн. Па тэхкультурах плян засыпкі выкананы толькі на 16 проц., па бульбе — на 23,9 проц., аднагадовых травах — 7,5 проц., і шматгадовых — 7 проц. Страхавых фондаў створана ня больш 15 проц.

Алепаўскі, Валосаўскі, Н.-Сельскі, Пяклюдаўскі і інш. сельсаветы дагэтуль яшчэ не прыступілі да стварэньня насенфондаў.

Апартуністы некаторых сельсаветаў імкнуцца адцягнуць засыпку насеньня. Асабліва гэта выявілася па Паўлаўскім сельсавеце. Рахункавод Паўлаўскага сельпо на сходзе калгасу імя Будзённага выступіў з прапановай адтэрмінаваць ссыпку насеньня яшчэ па месяц. Гэтай пулацкай вылазцы ня быў дан належны адпор.

Некатрыя сельсаветы і калгасы ў рабоце з давядзеньнем пасеўных плянаў да сельсаветаў і населішчаў. Да 156 калгасаў яшчэ не давядзены пасеўныя пляны. Да кулацка-заможных гаспадарак пляны па цьвёрдых заданьнях таксама не даведзены.

Н.-Польскі, Н.-Сельскі, Паўлаўскі, Слаўнаўскі, Саколінскі, Скуратаўскі, Валосаўскі і Алепаўскі сельсаветы не давялі пасеўных плянаў ні да аднаго калгасу, ні да адной вёскі.

Перадавыя сельсаветы і калгасы па-бальшавіцку разгарнулі падрыхтоўку да сяўбы. Калгасы «Беларуская вёска» і «Чырвоны гарадзец» ужо поўнасьцю закончылі ссыпку насенных фондаў. Усе калгасы гэтых калгасаў разьбіты на пазасобныя брыгады, якія прымацаваны да кожнай гаўны работы.

Козін.

РЭСПУБЛІКАНСКІ ПЛЯН ІЛЬНАЗАГАТОВАК ВЫКАНАН УСЯГО НА 56.5 проц.

БАЛЬШАВІКІ АДПОР САМАЦЁЧНЫМ, ПРАВА -АПАРТУНІСТЫЧНЫМ НАСТРОЯМ— АСНОЎНАЙ ПРЫЧЫНЕ ЗАЦЯЖКІ КАМПАНІІ

Выкарыстаць усе вагары павышэньня тэмпаў загатовак

Тэмпы ільназагатовак па БССР за апошнія пяцідневкі ня толькі не ўзьняліся, але нават зьнізіліся. На 1 сакавіка рэспубліканскі плян выкананы усяго на 56,5 проц. — прырост за пяцідневку 0,4 проц. Калгасы МТС здалі 59,9 проц. пляну, іншыя калгасы — 80 проц., у аднаасобным сэктары загатоўлена 38,9 проц.

Няма ніякага зруху на групе ільнаводчых раёнаў. Так, Асьвейскі раён выканаў плян на 41,8 проц., Бешанковіцкі — 47,9 проц., Вушацкі — 42,4 проц., Гарадоцкі — 40,2 проц., Горацкі — 41,8 проц., Дубровенскі— 42,6 проц., Чавускі — 49,1 проц., Чашніцкі — 45,5 проц.

«Правда» ў перадавым артыкуле ад 28 лютага зусім правільна падкрэсьліла, што прычына непапучальна - марудных тэмпаў ільназагатовак у радзе раёнаў у тым ліку і БССР — самацёчныя, права - апартуністычныя настрої, якія ў радзе месц не сустракаюць дастатковага адпору.

Некаторыя райкалгасаюзы, райкаапсаюзы, МТС не адпаюць належнай увагі правільнай арганізацыі перапрацоўцы, стварэньню пастаянных брыгад на месцы, тропцы. «Зьвязда» ўжо не адзін раз сьцігалізавала, што разрыў паміж месцамі, тропкай і здачай у радзе раёнаў стала зьвычайным зьявішчам. Ільнамальныя пункты ў пазасобных сельсаветах, калгасах бязьдзейнічаюць, або у лепшым выпадку працуюць у адну вымену.

Трэба безагаворачна рэалізаваць указаньні «Праўды» аб фарсаваньні перапрацоўкі і кінуць сілы на арганізацыю працы ў пунктах перапрацоўкі ільну, на ўзмацненьне брыгад і ўзьнясьцце прадукцыйнасьці працы трапальшчыкаў. Неабходна максымальна на выкарыстаць усе сродкі вытворчасьці — мяльна - сушыльна - трапальныя пункты, пазасобныя сушкі, мялкі і г. д., пераводзячы іх на работу ў 2-3 вымены.

Трэба даць бальшавіцкі адпор кулацка - рэакцыйнай тэндэнцыі ў частцы калгасаў, а таксама разбазарваньню і асяданьню валакна ў аднаасобнікаў, якія абавязаны здаць ганчарную прадукцыю па кантрактацыйных дагаворах.

Тое, што плян па аднаасобным сэктары выкананы усяго на 38,9 проц. сьведчыць аб наяўнасьці ў радзе раёнаў, сельсаветаў правааппартуністычнай недацэнкі ролі аднаасобніка ў ільназагатоўках.

Тэмпы ільназагатовак у аднаасобным сэктары павінны быць рэзка ўзьняты. Карэнным палянпшэньнем якасьці масавай работы сярод бедняцкіх і сераднякоў аднаасобнікаў, рашучым узмацненьнем барацьбы з кулаком і кулацкай агітацыяй, трэба дабіцца ліквідацыі адставаньня аднаасобнага сэктару і выкананьня ім сваіх абавязацельстваў перад дзяржавай. Неабходна распачаць прэвэрку выкананьня кантрактантамі сваіх абавязацельстваў. Кантрактанты, якія злосна ўхіляюцца ад сдачы ільнавалакна дзяржаве і нарушаюць дагаворы, павінны быць прыцягнуты да суровай адказнасьці.

Паведамленьні з некаторых раёнаў (Капыль) сьведчаць аб тым, што пры патуранні пазасобных сельсаветаў і работнікаў кулацка - заможныя гаспадарлі злосна зрываюць ільназагатоўкі. Трэба бязьлітасна біць па кулацкім сабатажы і па тых арганізацыям і работнікам, якія патураюць гэтаму сабатажу. Цьвёрдыя заданьні павінны быць спагнаны поўнасьцю.

На барацьбу за лён, за 100 проц. выкананьне пляну павінен быць узьняты ўвесь калгасны і вясковы актыў, жанчын, моладзі, разгорнута сацыялістычнае спаборніцтва сярод перапачаўшых на лепшую дапамогу адстаючым.

Поўнае выкананьне пляну ільназагатовак — адна з важнейшых умоў пасьпяховага арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў і падрыхтоўкі да сяўбы.

Адна аасобны сэктар ігнаруецца

ТАЛОЧЫН.

Апошняя пяцідневка дала зусім мізэрны прырост — усяго 0,7 проц. Раённы плян выкананы на 1 сакавіка на 46,7 проц.

Такі тэмп загатовак тварыць аб поўнай бязьдзейнасьці значнай часткі сельсаветаў, а таксама райсаюзу, райкалгасаюзу і райкаапсаюзу.

Як і раней галоўна пятуцца ў хвасьце — Паўлаўскі сельсавет — 20,6 проц. пляну, Плоскі — 20,8 проц., Няклюдаўскі — 25,6 проц., Саколінскі — 28,5 проц., Лулахоўскі — 29 проц. Гэтыя сельсаветы за апошнюю пяцідневку не здалі ніводнага кілё палакна.

У выніку бязьдзейнасьці раду месцовых арганізацый плян па аднаасобным сэктары выкананы усяго на 15,9 проц. Цьвёрдыя заданьні з пугацказаможных гаспадарак спагнаны на 15,7 проц.

Стаўка на самацёк, адсутнасьць на савай растлумачальнай работы школ загатовак у Коханаўскім сельсавеце прывялі да таго, што пры 87,7 проц. выкананьня пляну калгасамі, аднаасобны сэктар здаў усяго 15,4 проц. Па Слаўнаўскім сельсавеце калгасы здалі 94 проц., аднаасобнікі 16 проц.

У Талочынскім раёне ёсьць рад перадавых калгасаў, якія паказалі ўзоры барацьбы за лён і ня толькі выканалі, але перавыканалі плян. Так, калгас імя Будзённага, Слаўнаўскага сельсавету, здаў звыш пляну 12 цэнтн. валакна. За ўзорную апрацоўку і своячасовую здачу таварнай прадукцыі дзяржаве калгас імя Будзённага прэміраваны мануфактурай на 300 руб. Посьпехаў калгас дабіўся ў результаце добрага кіраўніцтва праўленьня, правільнай арганізацыі і расстаноўкі сіл, брыгаднага метаду работы.

Раўнаючыся па перадавых Талочынскі раён павінен ліквідаваць адставаньне і ў першую чаргу ўмацаваць тэмпы загатовак у аднаасобным сэктары.

К.

Прыклад Крычава—усім раёнам БССР

КРЫЧАЎ (БЕЛТА).

КРЫЧАЎСКІ РАЁН ПОЎНАСЬЦЮ ВЫКАНАЎ ПЛЯН ІЛЬНАЗАГАТОВАК.

НАРАДА СТАРШЫНЬ СЕЛЬСАВЕТАЎ І РАБОТНІКАЎ ЗАГАТОЎЧЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ ВЫСУНУЛА СУСТРОЧНЫ У РАЕЎМЕРЫ 10 ПРОЦ. АГУЛЬНАГА ПЛЯНУ.

НАРАДА АБАВЯЗАЛАСЯ РЭАЛІЗАВАЦЬ СУСТРОЧНЫ ДА 20 САКАВІКА І ВЫКЛІКАЛА НА САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА КЛІМАВІЦКІ І ЧЭРЫКАЎСКІ РАЁНЫ.

ЛЁЗУНГІ ДА 8 САКАВІКА

У дзень 8 сакавіка бальшавіцкае шчырае прывітаньне працоўным жанчынам усяго сьвету. Няхай жыве міжнародны жаночы дзень! Няхай жыве Камінтэрн!

Аплаціць рахунак сацыялістычных палёў—

справа гонару кожнага рабочага заводаў сельгашмашынабудаўніцтва. Вытворчыя непаладкі на „Чырвоным мэталісьце" зрываюць выпуск плугоў „Эбэргард" і барон „Зыг-заг"

Зямацаваць дасягнуты ў канцы лютага пералом

Бесперапынная вытворчая праграма заводам «Чырвоны мэталіст» выканана толькі на 94 проц. У лютым крыва выканаўня ніяко больш знізілася і прамфінплян за гэты месяц выкананы на 87,9 проц. Асабліва адстае завод у выпуску бульбакапалак, праграма вырабу якіх выканана ўсяго на 41,66 проц. Замест 300 бульбакапалак па плане фактычна выпушчана 125. Не выконваецца праграма боран, «зыг-заг» і балетных плугоў «Эбэргард»». Замест 1.500 комплектаў боран, выпушчана 1.214 (80,9 проц.); замест 30 плугоў — 27, або 90 проц.

Асноўныя прычыны адставання крыюцца ў бясплановай і нянаўмеснай рабоце цэхаў, асабліва такарнага і загатоўчага. Выпуск боран «зыг-заг» па-ранейшаму зрываецца з-за адсутнасьці другой ковачнай машыны для выпрацоўкі патрэбнай колькасьці зубоў. Адзел рацыяналізацыі, узяўшы на сябе абавязак прыстасаваць для коўкі зубоў гвазьдзільны варштат, амаль нічога ў гэтым напрамку не зробіў. Да гэтага часу ніяко паваг не падрыхтаваны патрэбныя чарцяжы. Значная частка віны падае і на загатоўчы цэх, які несвачасова рыхтуе дэталі. У загатоўчым цэху часта наглядаюцца нязбайныя адносіны пасобных рабочых і нават брыгадзіраў да работы. Так, брыгадзір тав. Шульман замест таго, каб вучыць, як трэба змазваць за якасьць, сам зрабіў 10 штук бракаваных калец і захаваў іх ад прыёмшчыка. Выраб браку ў гэтым цэху ўвашоў у сыстэму. Пры правяраньні інжэнэрыязмы, у оборачным цэху знойдзены 1.800 штук бракаваных зубоў, якія ня ўлічаны прыёмачным апаратам.

Вялі балотныя плугі «Эбэргард» у студзені і пачатку лютага па вытворчасьці з-за адсутнасьці сталёвага лісьця, дык зараз праграма—выраб плугоў нявыконваецца выключна па віне загатоўчага і такарнага цэхаў. Загатоўчы цэх цяпер зборачнаму цэху несвачасова і несвачасова зробленыя дэталі. Рамы для плугоў сьвідруюцца з уцямам ад вызначанага стандарту. З-за неправільнай выгібі васей, зборачным прыходзіцца траціць шмат часу на іх падгонку. Асабліва зрываецца зборка плугоў неправільная колка 5-цясьмяных балтоў, якія замест 16 мм. таўшчыні, куюцца разьмерам 19 мм. і больш. Зборачнаму цэху сыстэматычна падаюцца неправільна вымятыя сыпцы.

Не перабудаваў сваю работу і такарны цэх. Брак па вырабе качалак палявой васі для плугоў «Эбэргард» даходзіць у сярэднім да 30 проц. Неправільна робіцца сьвідраваньне кранштэйнаў для палявой васі і падпыпнікаў барознай васі, з прычыны чаго зборачкі прымушаны траціць шмат часу на падгонку дэталяй. З-за адсутнасьці прыстасаваньня для правільнай устаноўкі сыпц у калёсах, апошнія выраблюцца крывыя. Зборачны цэх часта прастойвае з-за несвачасовай пастаўкі дэталяй загатоўчым і такарным цэхамі. 2 сакавіка зборачных плугоў тав. Бульга прастаяў паўтары гадзіны толькі таму, што такарны цэх не падаў кранштэйнаў і валікіх падпыпнікаў, ня гледзячы на тое, што заказ на гэтыя дэталі зборачным цэхам быў дан свачасова. У гэты-ж дзень увесь вучастак зборкі плугоў—15 чалавек прастаяў больш гадзіны з-за несвачасовай пастачы ім парэдніх валікіх падпыпнікаў.

Ня меншая доля віны падае на тэхнічны аддзел, які да апошняга часу не падрыхтаваў дакладных чарцяжоў амаль для ўсіх дэталяй да плугу.

Не перабудаваў сваю работу і кантрольны апарат. Валікая колькасьць бракаваных дэталяй загатоўчага і рамонтнага цэхаў прымаецца за добраякасную прадукцыю і прасоўваецца далей, у выніку чаго шмат дэталяй прыходзіцца перарабляць апошнім, што адбіваецца на выкананьні прамфінпляну.

Адставаньне ў выпуску бульбакапалак тлумачыцца тым, што тэхнічны аддзел заводу ўсё яшчэ не ўдасканаліў вырабу плянэтных каробак, у выніку чаго пры фармоўцы стрымліваюцца перакосы. Брак па плянэтных каробках даходзіць да 70 і больш процантаў. Адміністрацыя ліцейнага цэху ня выканала пастановы канферэнцыі ліцейшчыкаў па якасьці. Брак па бульбакапалках даходзіць да 22,27 проц., з іх 13,3 проц. па віне адміністрацыі.

Усе паданыя факты гавораць аб тым, што завод «Чырвоны мэталіст» шмат аб'ектыўных прычын для невыкананьня свайго вытворчага заданьня ня мае. Завод у асноўным забясьпечан патрэбнай колькасьцю матар'ялаў, сырцом і рабочай сілай. Адсутнасьць апэратыўнай работы, выразнага планаваньня, увагі ў рабоце цэхаў — вось карэньні сыстэматычнага адставаньня.

Пятая пяцігодка лютага дала значны пералом у адносінах фарсаваньня выпуску пасеўных машын. Вытворчае заданьне па плугох «Эбэргард» выкананa на 175 проц. і боранах «зыг-заг» — на 97,3 проц. Такімі-ж тэмпамі выконваецца праграма па жмыхапрэськах — 139 проц. і карпарозках — 133,6 проц.

Уключыўшыся ў сталінскі паход, заводзкія арганізацыі і ўся заводзкая грамадзкасьць павінны замацаваць дасягнуты ў канцы лютага пералом у выпуску пасеўных машын з тым, каб канчаткова ліквідаваць ганебнае адставаньне.

Брыгада «Зьвязды» — Артабалеўскі, Альхімовіч, Гаўрыльчык, Хазанаў, Жытлоўскі, Тзвелаў, Каган, Зарубежны, Цімштэйн, Грынблат.

Рашуча перамагаць апартуністычныя адносіны да абарончай работы

Асноўныя задачы перавыбарчай

Справаздачна-перавыбарчая кампанія ячэек Асоавіяхіму, якая зараз праводзіцца, вялікую работу па ўзмацненьні абароназдольнасьці краіны. Справаздачна-перавыбарчая кампанія, на аснове пралетарскай самакрытыкі, павінна падвесьці вынікі праробленай працы і намеціць баявую праграму работы на далейшы перыяд.

Раённыя і гарадзкія саветы распрацоўваюць канкрэтныя планы перавыбарчай кампаніі. Пры раённых і гарадзкіх саветах арганізуюцца камісіі па правяраньні перавыбараў з прадстаўнікоў партыйных, камсамольскіх і прафарганізацый, райкалгассаюзу і МТС. З лепшых актывістаў, ударнікаў складаюцца самаправерачныя брыгады. Гарадзкія, раённыя рабочыя ячэйкі дапамагаюць у правяраньні перавыбарчай кампаніі вясковым ячэйкам. Брыгады і самаправерачныя камісіі дапамагаюць ячэйкам у перабудове работы па-новаму, забясьпечваючы перанясеньне цэнтру ўсёй работы ў цэх, брыгаду, групу.

На справаздачна-перавыбарчых сходах і раённых канфэрэнцыях неабходна шырока абмеркаваць работу саветаў і плянаў работ на 1932 г. у разрэзе кантрольных лічбаў кожнай арганізацыі, а таксама пытаньне аб удзеле асоавіяхімаўскіх арганізацый у выкананьні пляну чацьвертага, заключнага году пяцігодкі, падрыхтоўцы да трэцяй бальшавіцкай вясны і рабоце па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў.

Перавыбарчая кампанія ячэек і саветаў павінна зьявіцца паваротным пунктам у працы ладу арганізацый Асоавіяхіму, у справе перабудовы ўсёй работы па-новаму і большай актывізацыі работы нізавых ячэек. Неабходна дабіцца шырокага ўжываньня ў рабоце арганізацый мэтадаў самакрытыкі і ўдарніцтва, росту членаў арганізацый, адкрыцьця дамоў абароны, вузкавіных пунктаў і інш. У правядзеньні гэтай кампаніі надзвычай важная роля належыць цэнтральнаму, раённаму і фабрычна-заводзкаму друку.

Справаздачна-перавыбарчая кампанія павінна прыкаваць увагу ўсіх арганізацый да міжнароднага становішча, да задач інтэрнацыянальнага выхаваньня членаў, захаваньня клясавай чыстаты сваіх радоў, не дапускаючы клясава-варожых, чужых элемэнтаў, і ўзмацненьня барацьбы з апартуністычнымі адносінамі да абарончай работы.

Мабілізацыя рабочых і калгасных мас на ажыцьцяўленьне гістарычных пастаноў XVII усесаюзнай партканфэрэнцыі і XIV зьезду КП(б)Б, якія даюць разгорнутую праграму сацыялістычнага будаўніцтва, на ўзмацненьне абароназдольнасьці краіны, паляпшэньне якасьці работы асоавіяхімаўскіх арганізацый—асноўная задача справаздачна-перавыбарчай кампаніі.

Мураш кевіч.

Вызначыўся зрух

За апошні час вызначыўся некаторы зрух у рабоце раду ячэек Асоавіяхіму Церахаўскага раёну. У Церахаўцы арганізаваны дзьве хэмкаманды і гурток першай дапамогі. Створан опэцыяльны фонд для прэміяваньня ячэек Асоавіяхіму, якія паказалі лепшыя посьпехі ў сваёй рабоце.

З мэтай павышэньня ўдзелу камсамольскай арганізацыі ў рабоце Асоавіяхіму праведзена нарада сакратароў ячэек ЛКСМ. Арганізавана 16 новых ячэек АСО. Распаўсюджана вайсковай літаратуры на суму каля 200 руб. і 75 супрацьгазаў.

Б.

Што паказала праверка

Цэнтральным Саветам Асоавіяхіму БССР пры дапамозе курсантаў АБВШ праведзена абсьледваньне 14 раённых арганізацый Асоавіяхіму па пытаньнях стану вайсковай работы, ходу двухмесячніка праверкі вайсковай работы па вёсцы, арганізацыйнага і фінансавага становішча.

Праверка паказала, што яшчэ дакладнага ўліку страховай кадрыхтоўкі Камсамольскія арганізацыі прымаюць надзвычай слабы ўдзел у справе арганізацыі страхоўкага конкурсу.

Партыйнае кіраўніцтва работай арганізацыі Асоавіяхіму ў радзе мясцовасьцяў ажыцьцяўляецца слаба. На пытаньне камісіі—які ўдзел прымае райком у рабоце райсавету—загадчык арганадзелу Церахаўскага райкому КП(б)Б адказаў: «Нам няма чаго там рабіць, бо там сядзіць камуніст». Старшыня райвыканкому тав. Дупанаў не хацеў падпісаць акт абсьледваньня, заяўляючы, што работы райсавету ён ня ведае і з гэтай работай ня зьвязан, у той час, як па становішчы ён зьяўляецца старшынёй райсавету. У гэтым-жа раёне 4 месяцы ня было адказнага сакратара, у Хойніцкім з 15-га сьнежня зьмяніліся тры сакратары. Такая-ж цякучасьць і ў Талачынскім раёне.

Кіраўніцтва з боку райсаветаў ячэйкамі слабае. Работнікі Хойніцкага райсавету ня ведаюць, колькі ў раёне ячэек. Церахаўская чыгуначная ячэйка ня ведала ці ёсьць у раёне райсавет Асоавіяхіму. Гэтыя факты камэнтараў не патрабуюць.

Большая частка раёнаў ня ўключылася ў двухмесячнік праверкі міжзборавай і вайсковай работы. Усе райсаветы маюць вялікую запазычанасьць. Сеньненскі па пазыцыі «Трэці рашаючы»—2.000 руб., Буха-Каталёўскі—900 руб., Горацкі, Талачынскі, Крычаўскі зусім не рэалізавалі пазыкі. У Сураскім раёне ёсьць запазычанасьці звыш 500 руб. па членскіх узносах, у Церахаўскім раёне па 5-ай лётарэі Асоавіяхіму—917 руб., у Хойніцкім па 4-ай лётарэі—521 руб.

Пастановы II пленуму Цэнтральнага Савету Асоавіяхіму СССР і прэзыдыуму Цэнтральнага Савету АСО БССР вельмі слаба праводзяцца ў жыцьцё. Ячэйкі не перабудавалі сваёй работы па-новаму.

Мэтады сацпаборніцтва і ўдарніцтва ў рабоце большасьці ячэек адсутнічаюць. Гэта становішча высоўвае задачу перад раённымі партарганізацыямі—узмацніць кіраўніцтва работай Асоавіяхіму, каб узьняць абаронную работу на належную вышыню.

Федаровіч.

АГЛЯД ДРУКУ

„Брагін завёў дружбу з Марыляй і Настай..."

(„Калгасьнік Пятрыкоўшчыны Пятрыкоўскі раён)

Аб Пятрыкоўскім раёне «Зьвязда» пісала яшчэ ў лістападзе мінулага году. Яшчэ тады мы ўказалі, што ў гэтым раёне дапускаюцца грубыя «лявацкія» загібы. «Зьвязда» сыгналізавала, што ў радзе сельсаветаў раёну «лявацкая» практыка стала сыстэмай. Гэтыя скажэньні заключаліся ў злачынных антысерадняцкіх перагібах, у пагоні за дутымі процантамі калектывізацыі і басшабашным адміністраваньні. У прыватнасьці, мы выкрылі кулацкіх агентаў з Колкаўскага сельсавету, дзе «лявацкая» практыка пусьціла найбольш глыбокія карэньні.

Старшыня гэтага сельсавету Беларусаў давёў заданьні да 30 проц. адзасобных гаспадарак. Гэты махровы апартуніст адкрыта заяўляў, што «пальць серадняка не паскубеш, да таго часу ён у калгас ня пойдзе». За словамі ішлі справы: незаконныя арышты, штрафы, вобыскі і інш. «Левыя» загібы цесна перапляталіся з правай практыкай. Залічваючы серадняка ў кулакі, мясцовыя кіраўнікі патуралі сапраўдным кулаком.

Раённае партыкіраўніцтва глядзела скрозь пальцы на кулацкую работу Беларусавых. «Зьвязда» падкрэсьлівала, што:

«... райком партыі не рэагаваў на кулацкія перагібы і прымірэнча адносіцца да кулакоў».

Аб аналягічных фактах паведамляла і «Правда». Сыгналы друку цалкам пацьвердзіліся. У раёне выкрыта цэлая сыстэма самых абураючых «лявацкіх» перагібаў, в якімі раённае кіраўніцтва не вяло абсалютна ніякай барацьбы. Такое-ж прымірэнцтва праяўляе і раённая газэта «КАЛГАСЬНІК ПЯТРЫКОЎШЧЫНЫ». Камплекты «К. П.» — яркі дакумант клясавай сьлепаты і патурання апартуністам. «К. П.» ня толькі прымірэнча адносіцца да «лявацкіх» перагібаў, але і сам становіцца на шлях «левакоў», арганізуючы пагоню за голымі лічбамі калектывізацыі.

* * *

На старонках «К. П.» можна знайсьці самую дакладную інфармацыю аб інтымным жыцьці пятрыкоўскіх грамадзян. Газэта пільна сочыць за такімі, з дазволу сказаць, актуальнымі падзеямі, як жаніцьба каго-небудзь з мясцовых жыхароў. «К. П.» з энэргіяй, вартай лепшага выкарыстаньня, акуратна вядзе абывательскую хроніку.

«... хатнім Брагін завёў дружбу з калгасьніцамі Мажар Марыляй і Тапецкай Настай.

... Кобец жаніўся і вяртаўся ў царкве.

Шляга, Красоўскі і інш., арганізуюць брыгаду і гуляюць у карты...».

Кобец жаніўся... Брагін сябруе з Мар'яй і Настай... вось якія, так сказаць, сур'ёзныя праблемы хвалююць рэдакцыю «К. П.». А аб перагібах, аб барацьбе з «лявацкай» практыкай—ні слова. Газэта далікатна маўчыць і не жадае бачыць, што ў цэлым радзе сельсаветаў «лявацкія» перагібы перарасьлі ў сыстэму. Кіраўнікі гэтых сельсаветаў займаліся арыштамі і штрафамі, а «К. П.» знаходзіў патрэбным сыгналізаваць толькі аб тым, хто з кім сябруе і хто з кім вянчаецца...

Гэта — не выпадковасьць. У сваёй праграмнай перадавой аб задачах газэты рэдакцыя «К. П.» старанна затушавала пытаньне аб барацьбе з правымі і «левымі» апартуністамі. «К. П.» толькі неакрэсьлена паабяцаў, што ён

«... АБВЯСЬЦІЦЬ безупынтасную барацьбу правому апартунізму ў тэорыі і на практыцы і «левым» загібам» (6 лістапада 1931 г.).

Гэтай барацьбы рэдакцыя, аднак, так і не абвясьціла. Затое ў тым-жа нумары газэта пасьпяшыла агаласіць «лявацкі» лёзунг пагоні за дутымі процантамі калектывізацыі. Ва ўнісон мясцовым «леваком» газэта заклікае

«... забясьпечыць новы прыліў бяднацка-серадняцкіх гаспадарак у калгасы».

«К. П.» настойліва патрабуе

«... разгарнуць напружаную работу за далейшы калгасны прыліў і арганізацыю новых калгасаў».

Прызывы рэдакцыі акрылілі мясцовых «левакоў». У пагоні за дутымі процантамі калгаснага прыліву У РАЕНЕ АДКІНУЛІ У БОК АРГАНІЗАЦЫЙНА - ГАСПАДАРЧАЕ УМАЦАВАНЬНЕ КАЛГАСАЎ. АБ ГЭТАЙ ЦЭНТРАЛЬНАЙ ЗАДАЧЫ КАЛГАСНАГА БУДАЎНІЦТВА І МЯСЦОВЫЯ РАБОТНІКІ І САМА ГАЗЭТА УСПАМІНАЛІ ТОЛЬКІ ДЛЯ ФОРМЫ. Агітуючы за новы прыліў рэдакцыя скромна абтушавала ці шматлікіх фактах «лявацкіх» перагібаў, якія дапускаліся ў раёне. Аб гэтых фактах взагавары ў цэнтральным друк. «Зьвязда» і «Праўда» пазвалі канкрэтных посьпітаў зла і выкрылі «лявацкую» практыку, якая мела месца ў раёне, але і пасьля гэтага «К. П.» захоўвае маўчаньне пішыню. На артыкулы «Зьвязды» і «Праўды» газэта не адгукаецца ні адным словам. Яна дыпляматычна робіць від, што нічога па бачыць, не заўважае, ня чуе.

Ёй няма ніякай справы да злачынных скажэньняў партыйнай лініі ў раёне. Рэдакцыя палічыла больш мэтазгодным запаціць інфармацыяй аб асабістых прыгодах пятрыкоўскіх грамадзян. Ёй няма ніякай справы да таго, што ў цэлым радзе сельсаветаў заготоўкі правозіліся ня інакш, як пры дапамозе арыштаў, вобыскаў і штрафаў. Рэдакцыя была занята: яна весяліла мясцовых абывателяў пошлымі жартамі ім адрасе нашай канструкцыі. На старонках «К. П.», напрыклад можна знайсьці здымак дохлай каровы. Не падумайце, аднак, што гэта проста дохлая карова. Аказваецца зусім не. «К. П.» называе дохлай каровай... савецкую канструкцыю. Як бачыце, жарты газэты іншы раз прымаюць антысавецкі характар. Называць савецкую канструкцыю дохлай каровай можа толькі клясавы вораг.

Калі райкому, парэшце, прыйшлося прыняць пастановы на артыкулах «Праўды» і «Зьвязды», газэта апублікавала іх. Але толькі апублікавала. Аб сваіх памылках, аб сваёй «лявацкай» пагоне за голай лічбай, аб сваім ганебным патуранні «леваком» газэта не сказала ні слова. Рэдакцыя пасьпяшыла ўмыць рукі. Рэдакцыя робіць від, што нічога па сутнасьці і ня было. Апартуністы і прымірэнцы не жадаюць прызнаваць сваіх памылак. Зброеносцы «лявацкіх» загібаў замятаюць сьляды. НУМАР НЯ ПРОЙДЗЕ.

Прозьвішча рэдактара газэты—П. Хільковіч.

Гомсельмаш перамагае „дзіцячыя хваробы" росту

Забесьпячэньне заводу сырцом—абавязак усіх снабжаючых арганізацый

ГОМЕЛЬ. Да канца 1931 г. Гомсельмаш перамог „дзіцячыя хваробы" росту і асваеньне новай вытворчасьці, вынёс на шлях пасьпяховага выкананьня колькасных і якасных паказальнікаў прамфінпляну.

Калі ў першым квартале мінулага году прадукцыя заводу складала 1.079 тыс. руб., а вытворчае заданьне выконвалася толькі на 58,5 проц., дык у чацьвертым квартале прадукцыя ўзрасла да 2.949 тыс. р., а выкананьне прамфінпляну да 96,8 проц.

Выраб сячкарань, бульбамыек і буль басартовак доўгі час не налажваўся, дзенны выпуск хістаўся ад 2 да 3 машын. У чацьвертым квартале мінулага году выпушчана ўжо 1.578 сячкарань, 835 бульбамыек і 814 бульбасартовак.

Завод разгарнуў рашучую барацьбу за выкананьне жаданых паказальнікаў, прадукцыйнасьць працы ў параўнаньні з першым квартałам павялічылася больш чым у два разы; брак па ліцьці зьнізіўся з 18,4 да 10 проц. За 1931 год страты заводу з-за браку прадукцыі складаюць каля 75.000 р.

Прагулы, якія складалі ў першым квартале 2,8 проц. зьменшыліся ў сьнежні да 1,6 проц.

Гэтых посьпехаў завод дабіўся дзякуючы таму, што партарганізацыя стала на чале барацьбы за прамфінпляц, што вызначан рад сур'ёзных і грунтоўных мерапрыемстваў па рэалізацыі 6 умоў тав. Сталіна. У канцы мінулага году на прагрэсыўцы працавала 20 проц. рабочых. Па гаспадарчы разрахунак перайшлі 24 брыгады з 760 рабочых. З агульнай сумы эканоміі атрыманай ад рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў—290.000 р., каля 100 тыс. р. прыходзіцца на эканомію ад рабочых прапаноў.

Пасьпяховае ажыцьцяўленьне колькасных і якасных паказальнікаў прамфінпляну дало магчымасьць значна зьнізіць сабекошт прадукцыі: калі ў першым квартале сабекошт сіласарэзак складаў 588 руб., дык у апошнім квартале ён зьніжаецца да 400 руб., або на 32 проц. Аналягічны малюнак наглядаецца і па іншых машынах.

Студзень 1932 г. характарызуецца далейшым паляпшэньнем ходу вытворчых паказальнікаў. Брак па ліцьці памяншаецца з 10,6 да 9,2, прастої —з 2.935 да 874 чалавека-гадзін, цякучасьць рабочай сілы скарачаецца з 7,2 да 5,1 проц. Аднак вытворчая праграма за студзень па гатовай прадукцыі выкапана толькі на 36,5 проц. (калі ўлічыць нясканчаную прадукцыю, дык атрымаецца 90,8 проц.).

Асноўнай прычынай нездавальняючага выкананьня прамфінпляну за студзень зьяўляецца дрэннае забесьпячэньне заводу сырцом: у студзені ў адносінах выпуску гатовых машын, завод працаваў толькі 12 дзён. Можна прывесьці лічбы, якія характарызуюць гэта. Пры патрэбнасьці ў ліставым жалезе ў 90 тон, завод фактычна меў 33 тоны, асаблівы дэфіцыт адчуваўся ў найбольш ходкіх асартымэнтах — 1, 1,5 і 2 м/м. Прысылалі часта недобраякасны сырц, што адмоўна адбівалася на прадукцыйнасьці працы.

У лютым становішча са снабжэньнем заводу палепшылася; адзначаўся рэзкі пералом у галіне выкананьня прамфінпляну. За дзьве дэкады лютага месячны прамфінпляц выкананы на 82 проц. Калі ўлічыць простой на працягу аднаго дня з-за адсутнасьці энэргіі, невыкананьне пляну вырабу бульбамыек з-за недахопу сырцу, дык мы атрымаем значнае перавыкананьне заданьня. Завод з дня ў дзень перавыконвае вытворчыя пляны выпуску пасобных машын. Возьмем апошнія дні: 25-га лютага выпушчана 37 сіласарэзак — 160,8 проц., 21 сячкарня — 161,5 проц., 20 бульбасартовак — 117,6 проц., 28-га лютага 35 сіласарэзак — 152,1 проц. заданьня, 21 сячкарня — 161,5 проц. плану, 20 бульбасартовак—117,6 проц. і г. д.

Першая дэкада лютага характарызуецца буйнай перамогай на фронце аўладаньня вытворчасьцю новых машын. Гомсельмаш упяршыню ў СССР выпускае канюшына-сартоўкі, вытворчае заданьне па якіх з дня ў дзень значна перавыконваецца. Побач з гэтым троба адзначыць, што ў студзені і лютым праводзілася валікая палярыхтоўка да асваеньня новых машын —сіласарэзак «Інтэрнацыянал».

Бліжэйшыя задачы, якія павінны забясьпечыць замацаваньне бальшавіцкіх тэмпаў—гэта далейшая рэалізацыя 6 умоў т. Сталіна і рацыянальнае палянізаваньне снабжаньня заводу сырцом.

Калектыўны рабкор «Зьвязды» —рэдакцыя шматтыражкі «СЕЛЬМАШАЦ».

АПАРТУНІСТЫЧНЫЯ СКАЖЭНЬНІ ЛІНІІ ПАРТЫІ Ў ПЕТРЫКАЎШЧЫНЕ

Сыгналы «Зьвязды» аб грубых скажэньнях лініі партыі ў радзе сельсаветаў Пятрыкоўскага раёну, аб абураючых фактах нарушэньня рэвалюцыйнай законнасьці не турбавалі мясцовых работнікаў. Не зварачала ўвагі на гэта і раённае кіраўніцтва. Пра-апартуністычная практыка і «лявацкае» адхіленьне ў раёне ўсё пашыралася.

Асабліва абураючыя факты скажэньня лініі партыі дапушчаны ў Сьнядзінскім, Грабаўскім, Колкаўскім і Камаравіцкім сельсаветах. Асобы, якія стаялі на чале гэтых сельсаветаў (Высочыны, Бялюсопрэт, Беларусаў, Лобан і інш.) аказаліся на поводзе ў кулакоў. Іх дзейнасьць была накіравана на абарону кулака і падрыў калгаснага будаўніцтва. Выкарыстоўваючы гэтых махровых правапартуністычных элемэнтаў, кулацтва ў радзе выпадкаў скапіравалася нацыянальнага абкладваньня, пралазіла ў калгасы і праводзіла там падрыўную работу.

З другога боку ў гэтых сельсаветах усе гаворкі гаспадарча-палітычных кампаній Арганізаціяй пры адсутнасьці якой-бы там ні было рэгулюючай мясавай работы. Гэта работа падмянялася самым абураючым матацкім «лявацкім» адміністраваньнем. Мясцовыя гора-кіраўнікі разважалі: «наш селянін любіць, каб яго добра пагаварылі». Іх словы не разыходзіліся з іншымі. У той час, як кулацка-заможная частка гэтых сельсаветаў бесперашкодна [illegible] выкананьне даных ім [illegible] на загатоўках, на [illegible] масы пакладаліся [illegible].

Раённае кіраўніцтва не мабілізавала партарганізацыю на барацьбу супроць кулацкай агентуры — правага апартунізму, як галоўнай небясьпекі на цякучым этапе, «левага» апартунізму і прымірэнцтва. Зусім адсутнічала арганізацыйнае кіраўніцтва работай партячэек. Райком ня вёскі аб няправільнай арыентацыі мясцовых пэрэгібаў, ня ставіў на вострае абмеркаваньне ў партячэйках. Райсаб у пытаньнях загатовак гае сельсаветам такую ўстаноўку: «Процант кулацка-заможных гаспадарак павінен складаць ад мешн 5 да агульнага ліку сялянскіх дваро ў і ня мешн 12-15 да агульнага ліку». У многіх месцах нарэшце: рэкі ня мешн 12-15% пазбаўлена дырэктывай, дык больш колькі хочаце можна. І дзьмуць у такіх «лёгкіх» разважаньнях, у асобных сельсаветах цьвёрдыя заданьні давокліся да 35-40 проц. гаспадарак. Прычым гэтым гаспадаркам давалася заданьне 110-170 проц. агульнага пляну загатовак па сельсавеце. Зрозумела, што ў такім выпадку цьвёрдыя заданьні давіліся ня толькі кулакам, але ў пераважнай большасьці серадняцкім гаспадаркам. Напрыклад, у Грабаўскім сельсавеце з 62 гаспадарак, якім былі даны цьвёрдыя заданьні, 41 гаспадарка аказалася серадняцкай, у Камаравіцкім сельсавеце з 77 цьвёрда-заданых — 42 серадняцкія гаспадаркі.

Ячэйкі кулацка-заможных гаспадарак, выкарыстоўваючы апартуністычную практыку кіраўніцтва партячэек і сельсаветаў, сабатавалі выкананьне плянаў загатовак. У [illegible] раёну і райвыканкому разам з сельсаветамі работнікамі, часта упускаючы з пад увагі яўна кулацкія гаспадаркі, скапіляваўшы свае сілы на вобыск хлеба ў серадняцкіх і бяднацкіх гаспадарках. Гэтакімі мэтадамі «левыя» ліквідавалі сяду на мыльны бурбалкі ворага.

Характэрна, што такі шкадлівы партыі т. Урэцкі зрабіў спробу прыпісаць зацягу [illegible] райкому Каслову і сакратару Грабаўскага партячэйкі Мушкаўцу аб недастатковасьці вобыску ў бяднацка-серадняцкіх гаспадарках, дык з ім жорстка расправіліся: арыштавалі і пасадзілі ў халодны склеп.

Адсутнасьць бальшавіцкай барацьбы з апартуністычнымі скажэньнямі лініі партыі ў гэтым раёне прывяла да адставаньня работы ў выкананьні асноўных задач партыі. Прамфінплян за мінулы год ў раёне зірвана сакрушальна. Калгасная гаспадарка — палітычная кампанія праваны. Выкананьне пляну абкладваньня не дасягае і 60 проц. Падрыхтоўка да восенняй засеўнай кампаніі праводзіцца вельмі слаба.

Партыйная арганізацыя яшчэ да гэтага часу не пераключылася на выкананьне цэнтральнай задачы — арганізацыйна - гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў. Па правядзіцца сямкоўстыка калгасаў ад кулацкіх элемэнтаў. У пераважнай большасьці калгасаў пляну збываньня. Работа з калгаснымі актывам не разгорнута, не стабілізуюцца калгасныя масы на барацьбу з буржуазнымі фракцыямі тэндэнцыямі. Характэрным прыкладам на сёмых этапах і зьмешкі работы для раду вызначыў Патрыкоўскай партарганізацыі зьяўляецца Піцкая партячэйка. Гэта ячэйка [illegible] 6 [illegible] за [illegible] ўвесь мінулы год толькі адзін раз абмеркавала пытаньне аб рабоце ў лясным калгасе. Пытаньне гэта стаяла па сходзе ячэйкі 26 лістапада. Прынятая пастуцная пастанова: «Выкінуць з калгасу Самбука Сілу, Агрэмацінць жывёлу на 100 проц. Калектывізаваць усю пёсту на 100 проц. да 1 мая 1932 г.». Гэта пастанова — яркі ўзор ігнараваньня ячэйкай цэнтральнай задачы партыі ў справе калектывізацыі сельскай гаспадаркі. Замест сканцэнтраваньня ўсёй увагі на справе арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, ячэйка ставіць перад сабой задачу «лявацкай» пагоні за лічбамі калектывізацыі.

Усе гэтыя факты апартуністычнага скажэньня лініі партыі маглі мець месца па працягу доўгага часу толькі таму, што ў арганізацыі не разгорнута бальшавіцкая самакрытыка. Раённае партыкіраўніцтва не пераключылася на палярызаваную апарэцыйную работу, арыентуючы адносіцца да правапартуністычнай практыкі і «лявацкіх» загібаў.

Усе гэтыя факты прубога скажэньня партыйнай лініі ў рабоце Пятрыкоўскай партарганізацыі зараз вызначыў прыгадай ЦК КП(б)Б. Раённае кіраўніцтва, якое прымірэнча адносілася да правага апартунізму на практыцы і «лявацкіх» перагібаў зьняла з работы. Канкрэтныя пытаньні ў скажэньні лініі партыі, у парушэньні рэвалюцыйнай законнасьці павінны быць прыняцьцяны на суровай самакрытыцы. Трэба пазбавіцца выпрацаць усе дапушчаныя скажэньні і на-бальшавіцку мабілізавацца на ажыцьцяўленьне задач чацьвертага, заключнага году пя-

А. Хацкевіч

2 гады шэфства заводу імя Варашылава над НКФ

Два гады назад у часе чысткі апарату НКФ БССР, якая выявіла вялікія скрытыя класавай лініі ў фінансавай рабоце, калектыў чырвонасьцяжнага заводу імя Варашылава ўзяў шэфства над Наркамфінам.

Два гады, што прайшлі з таго часу, даюць права канстатаваць што шэфства варашылаўцаў не зьявілася простай урачыстай дэкларацыяй, а было сур'ёзным практычным крокам наперад на шляху ажыцьцяўленьня дырэктыў XVI зьезду УсеКП(б) пазмоц кантролю рабочых вышэй над дзяржаўным апаратам, па шляху рэалізацыі ідэі Леніна аб дарэвольным выкананьні дзяржаўных абавязкаў кожным працоўным пасьля работы на вытворчасьці.

Аздараўленьне пры дапамозе рабочых заводу імя Варашылава асабістага складу апарату НКФ, практычнае ажыцьцяўленьне ідэі сацыялістычнага сумяшчэньня, вылучэньне ў апарат НКФ на пастаянную апарацыйную работу рабочых з вытворчасьці, актыўны ўдзел заводзкіх брыгад у правядзеньні раду фінансавых кампаній, пастаноўка фінансавай работы на самім заводзе на ўзорную вышыню— такавы ў асноўным вынікі шэфства заводу імя Варашылава.

Дапамога шэфаў набыла асаблівае значэньне ў сувязі з тым, што фінансавы апарат у мінулым годзе для выкананьня пастаўленых перад ім адказных задач [illegible] быў рашуча [illegible] пікацыйна - масавай апарацыйнай фінансавай працы. Калектыў заводу імя Варашылава зьявіўся моцным апорным пунктам у перабудове фінансавай работы.

Троці год шэфства заводу над фінансавым апаратам зьяўляецца годам разгорнутай барацьбы за выкананьне народна - гаспадарчага пляну ваключнага году пяцігодкі. На аснове дырэктыў XVII Усесаюзнай партканфэрэнцыі, працоўныя Савецкага Саюзу прыступілі да складаньня новага пяцігадовага пляну сацыялістычнага будаўніцтва, асноўнай задачай якога зьяўляецца канчатковая ліквідацыя капіталістычных элемэнтаў і стварэньне бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва. Адзін з апошніх вучасткаў сацыялістычнага будаўніцтва займае зараз фінансавая сыстэма.

XVII Усесаюзная партканфэрэнцыя рашуча перарэзьліла антыбальшавіцкі характар «левай» фразы аб перагоне да «пратуўта - абмену» і аб «атмірэньні прошлай» на новай стадыі будаўніцтва сацыялізму.

Фінансава-крэдытны апарат БССР, можа выканаць пастаўленыя вялікарныя задачы толькі пры ўмове пасьпяховага прасоўвання ўперад па тым шляху, асноўны напрамак якога быў узяты ў мінулым годзе.

Гэты напрамак — палепшыць масавая работа на мабілізацыі пралетарскай і калгаснай грамадзкасьці на барацьбу за фінансы, ускаленьне ў фінансавую работу вынайдзенных сацыялістычных метадаў працы, пасьлядоўны пралетарскі кантроль і далейшае арабатываньне апаратам.

Замацаваць, пашырыць і паглыбіць станоўчыя вынікі 2-хгадовага шэфства — абавязак сярэдняга спартыйных, прафесыянальных арганізацый і ўсяго калектыву заводу імя Варашылава і НКФ.

Узьняць на вышэйшую ступень шэфскую работу — гэта значыць узмацніць бяздэльнасьць фінансавага апарату. На аснове тэрміновай сумеснай работы з шэфамі — заводам імя Варашылава фінансавы апарат, пад кіраўніцтвам партыі, зможе выканаць усталяваныя на яго задачы.

У адзнаку шэфства

Народны камісарыят фінансаў выдаў спэцыяльную пастанову, прысьвечаную другой гадавіне шэфства рабочых заводу імя Варашылава над НКФ. У пастанове адзначана, што шэфства над фінапаратам зусім сябе апраўдала і значна дапамагло выкананьню задач, пастаўленых [illegible] рыят фінансаў пастанавіў выдаць калектыву заводу імя Варашылава грамату і мэтон ударніка за баявую работу на фінансавым фронце. У распарядженьні трыкотажнага заводу адпушчана 1.500 руб. на паляпшэньне матар'яльна-бытавых [illegible]

Насенфонд тэхкультур ссыпан толькі на 14 проц.

ГАРАДОК. (Ад нашага спэцкора).

Ссыпка насенных фондаў па раёне ідзе сонацёкам. Раённыя арганізацыі ня ведаюць, што робіцца на месцах. Вестні паступілі толькі

АБ АРГАНІЗАЦЫІ ПРАЦЫ У КАЛГАСАХ

ПАСТАНОВА НКЗ І ПРАЎЛЕНЬНЯ КАЛГАСЦЭНТРУ БССР

У выкананьне пастановы ЦК УсеКП(б) ад 4 лютага, ЦК КП(б)Б ад 22 лютага 1932 г. аб чарговых мерапрыемствах па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў і пастановы Калгасцэнтру СССР, калегія НКЗ і праўленьне Калгасцэнтру БССР пастанаўляюць:

Аб брыгадах

1. Абазьвязць райза, калгасаны і праўленьні калгасаў правесьці арганізацыю брыгад за ўсіх калгасах не пазьней 1 красавіка 1932 г.

Брыгады павінны арганізоўвацца, паводле вытворчага прынцыпу з пастаянным складам калгасьнікаў з тым, каб кожная брыгада, як правіла, выконвала ўсе асноўныя сельска-гаспадарчыя работы на працягу ўсяго году на поўных вымельных вучастках.

За кожнай пастаянай палявой брыгадай замацоўваюцца на ўвесь год поўныя зямельныя вучасткі з пасобнымі, культурамі, або групай культур, прычым культуры па вызначаных вучастках трэба камбінаваць з такім разьлікам, каб максымальна захаваць пастаянны склад брыгад. На гэтых вучастках брыгада выконвае ўсе работы, пачынаючы з ворыва і канчаючы ачрацоўкай і здачай прадукцыі.

Брыгада, выконваючы ўсе працэсы работ на замацаваным за ёю вучастку дае поўную адказнасьць за выкананьне заданьняў па выхадзе прадукцыі, як па колькасьці, так і па якасьці. Не дапускаць вызначэньня брыгадам вучастку зямлі для іх апрацоўкі ў вялікай колькасьці палёў севазвароту.

2. У дробных калгасах арганізуецца адна палявая брыгада, а ў сярэдніх і болш буйных арганізуецца 2-6 і больш брыгад.

У сельска-гародніх калгасах, апрача палявых брыгад, арганізуецца пасобныя брыгады па гародніцтве і садоўніцтве.

Стварэньне пастаянных брыгад не павінна, аднак, выключаць магчымасьці арганізацыі брыгад не на ўвесь сельска-гаспадарчы сэзон, а на пасобныя перыяды (пасеў, догляд за пасевамі, уборка) у тых калгасах, дзе гота ны клікаецца мясцовымі ўмовамі (размер калгасаў, арганізаванасьць).

3. Для абслугоўваньня жывёлагадоўчых тавэрных фэрм (МТФ, СТКФ і трусагадоўчых фэрм), а таксама для абслугоўваньня птушкагадоўчых і пчалярных фэрм, у кожным калгасе арганізуецца пастаянныя брыгады па кожнай фэрме паасобку, у тых калгасах, дзе апрача тавэрнай фэрмы, як выдучай галіны, ёсьць зарамаджаная жывёла розных відаў у невялікай колькасьці, арганізуецца асобныя брыгады для абслугоўваньня ўсіх відаў жывёлы па-за фэрмай.

4. Колькасны склад пастаянных калгасных брыгад у паляводзтве і гародніцтве ўстанаўляецца ў кожным калгасе паасобку, выходзячы з разьмеру калгасу, вытворчых заданьняў калгасу, норм выпрацоўкі і тэрмінаў выкананьня работ па перыядах.

Склад брыгад, нагрузка кожнай брыгады і арганізацыя работ упушы брыгады павінны быць зроблены так, каб усе работы, зьвязаныя з веснавой сяўбой былі праведзены ў нізкай вызначаных тэрмінаў.

Назва груп культур	Тэрмін сяўбы ў дзнях	СКАНЧЭНЬНЕ ПА ЗОНАХ Паўднёв.	Цэнтральн.	Паўночн.
1. Раньніх яравых, збожжавых, лубіну на насеньне і сьвежа-сьпелых бобовых і алеевых	10	8-V	12-V	18-V
2. Токачных (ільну і канапель)	10	15-V	20-V	25-V
3. Вульбы і кораніплодаў	15	15-V	20-V	20-V
4. Гародніх:				
а) капусты	10	20-V	25-V	30-V
б) столавых кораніплодаў	10	5-V	10-V	15-V
в) гуркі	10	15-V	20-V	25-V
г) памідоры	10	20-V	20-V	25-V
д) пыбуля	10	10-V	15-V	20-V
5. Іншых яравых	15	20-V	25-V	30-V
6. Пасоў на насеў усіх яравых скончыць не пазьней		20-V	20-V	30-V
7. Азімых культур	15	15-IX	10-IX	5-IX

УВАГА: Ільну раньняй сяўбы засеяць ня менш 75 проц. агульнай пасеўнай плошчы.

5. Пры набудове вытворчых брыгад трэба кіравацца наступнымі асноўнымі прынцыпамі: устанаўляецца патрэба рабочай і цяглай сілы для выкананьня ўсяго вытворчага заданьня калгасу на ўвесь год па перыядах, выходзячы з устаноўленых тэрмінаў выкананьня работ.

Устанаўляецца, на якіх галінах гаспадаркі і вытворчых вучастках арганізуецца пастаянныя брыгады. Арганізуецца брыгады для абслугоўваньня жывёлагадоўлі, выходзячы з норм выпрацоўкі і нагрузкі жывёлы на кожнага калгасьніка.

У паляводзтве брыгады арганізуецца па вытворчых вучастках з вядучымі культурамі з далучэньнем другіх культур для роўнамернай нагрузкі брыгад на ўсе перыяды, напрыклад, у ільнамалочным калгасе пры сумежных вучастках пасеву ільну брыгада арганізуецца на вучастках з пасевамі технічных культур і траў, збожжавых і прапашных культур. У бульбана-жывёлагадоўчым калгасе брыгады арганізуюцца на вучастках з прапашнымі і збожжавымі культурамі.

Пры вызначэньні вучастку брыгадам улічваць разьмяшчэньне на іх пасобных культур больш буйнымі масывамі.

При арганізацыі ў дробных калгасах адной брыгады на паляводзтве пасобныя групы гэтай брыгады прымаюцца і нясуць адказнасьць за выхад прадукцыі пасобных культур.

6. Пры набудове брыгад калгасаў пасеньні зьвярнуць асаблівую ўвагу на правільную расстаноўку сіл у брыгадзе, падбор у брыгадзе неабходнай колькасьці людзей па іх кваліфікацыі, падбор цяглай сілы, інвэнтару, абрэ, транспарту, устаноўленьне вытворчых заданьняў брыгадам, праверку і контроль іх выкананьня і пастаноўку належнага ўліку працы.

У вытворчым заданьні брыгадам абавязкова паказаць:

а) Аб'ём работы, тэрмін пачатку і скончэньня кожнага віду работ, падлягаючых выкананьню (ворыва, сяўба, прапоўка і г. д.).

б) Нормы выпрацоўкі па кожным відзе работ і іх ўдзельную вагу ў працаднёх, а таксама колькасьць працаднёў, якая вызначаецца брыгадзе на выкананьне ў цэлым усяго вытворчага заданьня.

в) Арганізацыйна - вытворчыя мерапрыемствы па кожным відзе работ і па кожнай культуры (тэрміны сяўбы, прырост ураджаю, тэрмін уборкі, адыход маладняка, удой, нормы высеву і інш.), заданьні па якасьці работы, размер аўкладу (у цэнтнярах, літрах, штуках і інш.).

г) Сьпіс замацаваных за брыгадай калгасьнікаў, жывёлы і інвэнтару.

7. У мэтах ліквідацыі абязьлічкі ў кармазабезпечанасьці сельска-гаспадарчым інвэнтаром і цяглай сілай да 1 красавіка павінны быць зроблены брыгадзірам праўленьняў калгасаў па асобным пэпісу ўсе машыны, інвэнтар, транспарт, абрэ і цяглая сіла, якія знаходзяцца на ст. брыгадзе. Пэпіс складаецца ў двух экземплярах, з якіх адзін знаходзіцца ў праўленьні калгасу, а другі ў брыгадзіра.

8. Умовы кожнай брыгады расстаноўку калгасьнікаў на гроўках, даху вытворчых заданьняў пасобным групам і замацаваньне за пасобнымі калгасьнікамі машын, інвэнтару, жывёлы і абрэ робіць брыгадзір. Калгасьнікі цясуць пенасрадную абязьлічку ў ніводнага работніка рабочай жывёлы і інвэнтару, які ім прыпісана пад расьпіску. Дробны бягучы рамонт дажыць на абавязку тых калгасьнікаў, за якімі замацаваны інвэнтар, машыны і абрэ.

9. Для падзелкі і падрыхтоўкі кармоў і догляду—рабочай жывёлы ў часе ачаўканьня на кожныя 20-25 коней выдучаецца конюх-фуражыр, які пісе адказнасьць за правільнае ўтрыманьне і кармленьне коней, а ва становішча коней несуць адказнасьць тыя калгасьнікі, якія на іх працуюць.

10. На тавэрных малочных фэрмах работа нізкіх калгасьнікамі і калгасьніцамі брыгады разьмяркоўваецца такім чынам, каб ніхто і кармленьне жывёлы і той жа асобай.

Для падзелкі кармоў, вадзі, падсьпіку, выдачы яго і нагляду за жывёлай у начны час—са складу жывёлагадоўчай брыгады выдучаецца пасобныя калгасьнікі.

11. У калгасах хутарскіх раёнаў пры арганізацыі брыгад улічваць асаблівасьці гэтага раёну (разьмяшчэньне пасеву пасобных культур на вялікай колькасьці асобных вучастках, расяляласьць насельніцтва пры хутарскай сыстэме). Набор складу брыгад у гэтых раёнах ажыцьцяўляць пры ўдзеле сяльсавету, сацыяльнага, эканамічнага і культурнага становішча сяльскіх жыхароў, з тым, каб ніхто і кармленьне жывёлы і той жа асобай.

12. Пры арганізацыі брыгад і разьмеркаваньні рабочай сілы па брыгадах улічыць неабходнасьць поўнага скарыстаньня жаночай рабочай сілы і падростку, вызваленьня лішкаў рабочай сілы і скарыстаньня лішкаў рабочай сілы на адыходніцкіх работах.

Аб брыгадзірах

1. Пэрацыйнае кіраўніцтва брыгадамі ажыцьцяўляецца непасрэдна брыгадзірам, таму праўленьні калгасаў абавязаны разам з арганізацыяй брыгад вызначыць брыгадзіраў са складу лепшых калгасьнікаў і калгасьніц, у першую чаргу ўдарнікаў, найбольш аўтарытэтных і добра ведаючых вытворчасьць і здольных арганізаваць калгасьнікаў на выкананьне вытворчага заданьня.

2. НКЗ і праўленьне Калгасцэнтру абавязае праўленьні ўсіх калгасаў не пазьней 1 красавіка г. г.:

а) азнаёміць брыгадзіраў з іх вытворчымі заданьнямі для кожнай брыгады пасобку;

б) перадаць брыгадзірам вытворчыя планы-нарады, устаноўленыя нормы выпрацоўкі, апісаньне работ у працаднёх, сьпісы і прапоўныя кніжкі для калгасьнікаў брыгады;

в) азнаёміць брыгадзіраў з зямельнымі вучасткамі, якія адводзяцца брыгадам для апрацоўкі;

г) перадаць брыгадзірам па вопісах рабочых коней, машыны, абрэ і інвэнтар.

3. Пасьля арганізацыі брыгад кожны брыгадзір павінен не пазьней 5 красавіка г. г.:

а) прапрацаваць на вытворчых нарадах з калгасьнікамі сваёй брыгады атрыманае вытворчае заданьне;

б) разьмеркаваць увесь склад брыгады на групы і даць кожнай групе калгасьнікаў вытворчае заданьне на перыяд веснавой сяўбы;

в) разьмеркаваць абавязкі, рабочую жывёлу і інвэнтар паміж калгасьнікамі брыгады.

4. Адказнасьць за ўсю работу брыгады як па якасьных, так і па колькасных паказальніках, нясе асобіста брыгадзір, у сваю чаргу брыгадзір пэрабрае поўнай адказнасьці ад кожнага калгасьніка за даручаную яму работу.

5. Праверка выкананьня заданьняў, улік працы, налічэньне і запіс працаднёў у прапоўныя кніжкі па колькасьці і якасьці працы робіць брыгадзір.

6. Брыгадзір павінен штодзенна інфармаваць праўленьне калгасу пытаньнямі перадачы штоденных дакладаньняў аб ходзе выкананьня заданьня па пэрадах.

7. Надаючы вялікую ролю і значэньне брыгадзіраў у калгаснай вытворчасьці і, каб не дапускаць цякучасьці складу брыгадзіраў, назначэньне і зьмену брыгадзіраў робіць выключна па пастанове праўленьня калгасу.

8. Абавязаць праўленьні калгасаў не пазьней 5 красавіка правесьці раённыя зьезды брыгадзіраў па спэцыяльных галінах гаспадаркі (жывёлагадоўля, тэхкультуры і інш.). Забясьпечыць дакладны кучот брыгадзіраў, сыстэматычную работу па ўзьнаўленьні іх кваліфікацыі.

Асаблівую ўвагу зьвярнуць на выдучаньне ў якасьці брыгадзіраў знатных-калгасьнікаў у першую чаргу з галіне жывёлагадоўлі.

Аб зьдзельшчыне

1. «Ажыцьцяўленьне на справе пастановы VI зьезду саветаў аб узмацненьні зьдзельшчыны, палепшэньні вучоту і аб апісаньні працы кожнага калгасьніка ў працаднёх, у залежнасьці ад колькасьці і якасьці зробленай ім работы, заставацца важнейшай задачай» (з пастановы ЦК УсеКП(б) ад 4 лютага — 1932 г.).

У адпаведнасьці з гэтым НКЗ і праўленьне Калгасцэнтру БССР прапануе ўсім раёнам, праўленьням калгасаў і калгасаў ажыцьцяўляць у гэтым годзе перавод на зьдзельнічыну ўсіх работ у калгасах з тым, каб палепшыць якасьць работы, павысіць прадукцыйнасьць працы і ўзмацніць дысцыпліну ў калгасах.

2. Абавязаць сэктар арганізацыі працы НКЗ і Калгасцэнтру да пачатку веснавой пасеўнай кампаніі выдаць асобнай брашурай прыкладныя нормы выпрацоўкі для ўсіх відаў сельска-гаспадарчых работ.

Аб ацэнцы работы калгасьнікаў у працаднёх

1. Ацэнка работ калгасьнікаў павінна рабіцца выключна ў працаднёх.

НКЗ і праўленьне Калгасцэнтру катэгарычна забараняюць правядзеньне і ацэнку працы калгасьнікаў па колькасьці прапрацаванага часу (у днях, гадзінах), а не па колькасьці і якасьці выкананай работы і папярэджваюць супроць спробы пераводу аплаты працы калгасьнікаў на трашовую зарплату. НКЗ і праўленьне Калгасцэнтру прапануюць праўленьням калгасаў разам з дачай вытворчага заданьня, тэрмінаў і якасьцю яго выкананьня вызначаць брыгадам поўную колькасьць працаднёў, зьвыш якой брыгадзір ня можа адлічваць за работу, выкананую усёй брыгадай.

2. У залежнасьці ад трудаёмкасьці, складанасьці і кваліфікацыі ўстанавіць наступныя 5 груп работ і зьдзельныя іх адзінкі:

а) лёгкія работы—з ацэнкай нормы выпрацоўкі ў 50 сотак працаднёў (палаўніты коней, прыкатванне глебы простым калком, варочаньне ільнасаломы, вартаўніцы салоў і г. д.);

б) сярэднія работы — з ацэнкай нормы выпрацоўкі ў 75 сотак працаднёў (ворыва, дыскаваньне, пасадка бульбы ў борозну, выбарка бульбы, зграбаньне сена конными граблямі, полка ільну і г. д.);

в) цяжкія работы (простыя)—з ацэнкай нормы выпрацоўкі ў адзін працадзень (копка пнёў, касьба траў касою, вожка сена, ручное жнво, вязка снапоў, выворванне бульбы, перабіваньне ільну, цялятніны, догляд маладняка, расьціл ільну, скотніц і канюшэн—фуражы і г. д.);

г) цяжкія работы, якія патрабуюць спэцыяльнага вопыту з ацэнкай нормы выпрацоўкі ў 1 працадзень і 25 сотак (касьба каркай, кіраўнічы ільнаперабіральні, падаваньне трасты ў ільнамялку, трошка ільну на мялцы, пасадка дрэў, скотніцы-даяркі, сьвінары, птушкіцы і г. д.);

д) кваліфікаваныя работы, з ацэнкай нормы выпрацоўкі ў 1 працадзень і 50 сотак (падача снапоў у барабан, трактарысты, машыністы, кавалі, гародніцы-садаводы, тэхнікі-жывёлаводы, вет сакітары са спэцыяльнай адукацыяй і г. д.).

3. На падставе гэтай прыкладнай разьбіўкі работ па групах кожны калгасьнік, у залежнасьці ад таго, наколькі ён ня ўмоў сваёй гаспадаркі.

4. Вынікі гаспадарчай дзейнасьці калгасу залежаць ад таго, наколькі калгас своечасова правёў сяўбу і ўборку і наколькі забясьпечана захаваньне маладняка ў часе апароху і ацёплу, таму ўдзел калгасьнікаў у працы ў напружаныя перыяды сельска-гаспадарчых работ дае права на атрыманьне большай часткі ўраджаю і даходу, чым работа ў той час, калі калгасу менш патрэбна працоўных затрат.

НКЗ і праўленьне Калгасцэнтру прапануюць праўленьням калгасу рабіць налічэньне пачаткавай колькасьці працаднёў калгасьнікам за поўны выхад на работу, выкананьне і перавыкананьне норм выпрацоўкі ў перыяд пасеву, прапоўкі, уборкі, апрацоўкі ільну і канапель і ў часе апароху у разьмерах 10-15 проц. ад агульнага ліку выпрацаваных калгасьнікам у гэтых перыядах працаднёў.

Тым калгасьнікам, якія ў перыяды напружаных работ прымалі непасрэдны ўдзел у працы, або зусім ня выходзілі на работу, зьмяжаць налічаную ім агульную колькасьць працаднёў да 10 проц.

5. Брыгадзе, якая перавыканала заданьне па выхаду прадукцыі звыш устаноўленага плянам, рабіць дадатковае налічэньне працаднёў за кожны цэнтнар збожжавых № 3-4 працадня, за кожны цэнтнар валакна—7-10 працаднёў, за кожную тону бульбы і кораніплодаў—7-10 працаднёў, за кожны цэнтнар гародніны—3-5 працаднёў.

За перавыкананьне брыгадай галавога заданьня па выхаду прадукцыі жывёлагадоўлі, рабіць дадатковае налічэньне працаднёў за кожны атрыманы звыш вытворчага заданьня цэнтнар малака—2 працадня, за выгадаванае нарасёт— 5 працаднёў, за кожнае яйцё—10 працаднёў.

При невыкананьні заданьняў па выхаду прадукцыі ў паляводзтве, гародніцтве і жывёлагадоўлі—робіцца зьніжэньне ў такім жа разьмеры за кожную адзінку атрыманай прадукцыі.

6. Устанавіць дадатковае налічэньне працаднёў тым калгасьнікам, якія берагла адносяцца да замацаваных да іх коней, за захаваньне коней у добрым выглядзе і добрай упітанасьці у разьмеры 10-20 проц. агульнай колькасьці працаднёў, выпрацаваных калгасьнікам.

За нядбайныя адносіны да каня, дрэнны догляд, дрэнную упітанасьць рабіць зьніжэньне працаднёў у разьмеры 10-30 проц. працаднёў, выпрацаваных калгасьнікам.

Праўленьні калгасаў, сумесна з равізійнымі камісіямі, павінны рабіць праверку становішча коней, прымацаваных да пасобных брыгад і калгасьнікаў, пасьля кожнага перыяду работ, але не радзей як 5 раз у год.

За злачынныя адносіны да каня, за калецтва і падзёж каня па віне калгасьніка, які на ім працаваў, калгасьнік аплачвае калгасу кошт загінуўшага каня.

7. У зьмену і дапатак да п. 9 пастановы «Аб рабоце брыгадзіраў і пачаткі ацэнкі яго працы», выданага Калгасцэнтрам БССР (ліпень 1931 г.) устанавіць налічэньне працаднёў брыгадзіру за кіраўніцтва брыгадай і работу па абмеры, узважваньні, уліку працы і запісу працаднёў па 1 сотцы працадня ад колькасьці працаднёў, выпрацаваных усёй брыгадай.

8. Ацэнку працы трактарыстаў рабіць ня толькі за колькасьць выкананай работы, але і за якасьць. Запіс працаднёў устанавіць, што колькасьць працаднёў для абслугоўваючага адміністрацыйна-гаспадарчага персаналу калгасу і агульная сума даходаў, якая належыць гэтым калгасьнікам на працаднёх, не павінны перавышаць 1 з пал.—2 проц. валавога даходу ў бутных калгасах і 2-3 проц. у дробных калгасах.

Аб вучоце працы

Для забясьпячэньня своечасовага і правільнага ўліку працы калгасьнікаў у 1932 г. НКЗ і праўленьне Калгасцэнтру прапануюць устанавіць наступны парадак:

а) улік колькасьці і якасьці работы кожнага калгасьніка і запіс у працоўныя кніжкі робіць брыгадзір;

б) вучот выкананай работы па палявых работах праводзіць штодзенна, а запіс працаднёў у працоўную кніжку калгасьніка—не радзей аднаго разу ў пятідзёнку, а ў жывёлагадоўлі—штомесячна ў залежнасьці з атрыманьнем прыплоду і вылучэньнем прыросту мясной жывёлы і маладняка; у малочных фэрмах запіс працаднёў рабіць штодзенна, выходзячы з колькасьці надоенага малака.

2. Абавязаць праўленьні калгасаў штомесячна (не пазьней 5 кожнага месяца) падлічваць агульную колькасьць працаднёў, выпрацаваных калгасьнікамі і рабіць запісы ў спэцыяльную кнігу вучоту працаднёў і практыкаваць вывешваньне сьпісу калгасьнікаў і колькасьці выпрацаваных працаднёў пабрыгадна.

3. Абавязаць старшынь праўленьняў калгасаў і калгасаводаў узяць пад свой непасрэдны нагляд забясьпячэньне калгасаў працоўнымі кніжкамі формамі і бланкамі па вучоту працы, і ў самы кароткі тэрмін выдаць калгасьнікам працоўныя кніжкі.

4. Абавязаць сэктар кадраў Калгасцэнтру і калгасаводы закончыць падрыхтоўку і выпуск рахункавых работнікаў для калгасаў, не пазьней як за 10 дзён да пачатку веснавой сяўбы.

5. Абавязаць праўленьні калгасаў да пачатку веснавой сяўбы правесьці на ўсіх рабках зьезды ўдзельнікаў групы-канфэрэнцыі калгасных рахункаводаў, на якіх прапрацаваць пытаньні калгаснага уліку.

Кантроль і праверка выкананьня

1. Кантроль і праверка работы брыгад праводзіцца праўленьнем, або па пастанове праўленьня камісіяй у складзе члена праўленьня калгасу, члена равізійнай камісіі і лепшага ўдарніка тэй брыгады, работа якой правяраецца. Праверка праводзіцца ў годзе выкананьня вытворчых заданьняў па перыядах (сяўба, міжрадная апрацоўка, уборка, здачная кампанія, апёл, апароп).

2. У мэтах ліквідацыі абязьлічкі ў работе па праверцы кожны член праўленьня і равізійнай камісіі павінен быць прымацаваны да пэўнай колькасьці брыгад.

3. Правяраная камісія робіць прыём ад брыгад і фіксуе выкананыя работы па скаканьні сяўбы і зьвяшчае ўсіх, пасьля заканчэньня работы па міжрадная апрацоўцы, уборцы ўраджаю і апрацоўцы асобных тэхнічных культур.

4. Камісія выяўляе ці адпавядае колькасьць засеянай плошчы заданьням, прадстаўленым брыгадам, і вытворчаму заданьню ці адпавядае якасьць работы правілам, якія даны праўленьнем калгасу, а таксама ці адпавядае колькасьць налічаных працаднёў брыгадзірам кантрольнаму заданьню праўленьня калгасу, як па якасьці, так і па колькасных паказальніках.

5. Пасьля ачэньня праверкі камісія складае ў пісьмовай форме акт, які перадае праўленьню калгасу.

Арганізацыйна-масавыя мерапрыемствы

1. Задача арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў настойліва патрабуе ад калгасных арганізацый стварэньня і выхаваньня калгаснага актыву з ударнікаў-калгасьнікаў. Райза, калгасаводы і праўленьні калгасаў павінны весьці сыстэматычную работу па вылучэньні і стварэньні калгаснага актыву. Правесьці дакладны вучот лепшых калгасьнікаў - ударнікаў, правесьці з імі канфэрэнцыі і нарады, пасылаючы лепшых на курсы па павышэньні кваліфікацыі і больш шырока вылучаць на вытворчую і кіруючую работу жанчын калгасьніц.

2. НКЗ і праўленьне Калгасцэнтру БССР абавязае ўсе райсаз і праўленьні калгасаў і саўгасаў правесьці шырокую масавую работу сярод калгасьнікаў, вакол выкананьня вытворчых заданьняў у надыходзячую веснавую пасеўкампанію, пакладзіўшы в основу гэтай кампаніі пастанову ЦК КП(б)Б ад 22 лютага 1932 г. «Аб чарговых мерапрыемствах па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў», адозву ЦК і СНК аб жывёлагадоўлі, пастановы ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб правядзеньні веснавой сельска-гаспадарчай кампаніі 1932 г.

Райсаз, праўленьні калгасаў і калгасаў забясьпечыць распрацоўку за ўсіх калгасах гэтых пастаноў, а таксама і пастановы НКЗ і Калгасцэнтру БССР аб арганізацыі працы ў калгасах.

3. У барацьбе за выкананьне пяцігодкі за 4 гады, за выкананьне і перавыкананьне плянаў 1932 г., на основе ўкажаньняў у практыцы калгасаў з умоў тав. Сталіна, выкарыстоўваючы небыты вопыт — калгасы павінны паказаць новыя ўзоры высокай прадукцыйнасьці калектыўнай гаспадаркі, уздымы ўраджайнасьці і павялічэньня выхаду тавэрнай прадукцыі, разьвіцця сацыялістычнай жывёлагадоўлі, узьняцьця прадукцыйнасьці працы і шырокага разгортваньня сацыяборніцтва і ўдарніцтва паміж брыгадамі, групамі ў брыгадах, паміж пасобнымі калгасьнікамі і таксама паміж пасобнымі калгасамі за выкананьне і перавыкананьне вытворчых заданьняў.

Весьці рашучую барацьбу з выпадкамі падмены актыўнасьці і самадзейнасьці калгасных мас голым адміністраваньнем, з праўленьнямі кулацка-спажывецкіх элементаў, ачышчаючы калгасы ад кулацкіх элементаў.

Нам. наркома НКЗБ ПАНМАТКА.
Старшыня Белкалгасцэнтру МІЦЬКОЎ.

Месячнік дарожнага будаўніцтва

Раўняйцеся па 12-ым вучастку!

Калгас „Прагрэс" паказвае лепшыя ўзоры барацьбы за плян дарбудаўніцтва

Зрух зусім нязначны

Трэцяя пяціднеўка месячніка дапамогі дарожнаму будаўніцтву ў параўнаньні з другой таксама не дае належнага зруху.

Па першым дарбудвучастку процант выкананьня пляну па вывазцы каменю раўняецца 6,14 супроць 4 проц. у папярэдний пяціднеўцы. Зусім спынілася вывазка пяску. Другі вучастак у сярэднім даў прырост за пяціднеўку па ўсіх паказальніках на 2 проц.

Такое-ж становішча з выкананьнем плянаў наглядаецца па трэцім, чацьвертым, пятым, дзевятым і дзяцятым дарбудвучастках. Некалькі лепш ў сёмым дарбудвучастку, які ўзьняў прадукцыйнасьць на 7 проц., дабіўшыся выкананьня штурмавога заданьня на 33,4 проц.

Найлепш са сваімі заданьнямі спраўіўся 12-ты дарвучастак.

Сваё месячнае заданьне па камені ён выканаў за першыя тры пяціднеўкі месячніка на 46,78 проц. і па пяску—на 47,3 проц.

Галоўная прычына адставаньня дар вучасткаў тлумачыцца адсутнасьцю масавай выхаваўчай работы сярод калгасьнікаў і алнаасобнікаў, слабым ўдзелам у месячніку друку як раённага, так і нізавога.

На буксір—тых, што адстаюць

Як паказвае вопыт перадавых калгасаў і сельсаветаў, выкананьне штурмавых заданьняў месячніка дапамогі дарожнаму будаўніцтву залежыць ад уменьня арганізаваць работу, рацыянальна расставіць рабочую сілу, ад пастаноўкі масавай растлумачальнай работы.

Аб гэтым яркі сьведчыць вопыт Дрысенскага раёну, які дабіўся высокіх паказальнікаў у выкананьні пляну.

Шырокае разгортваньне масавай работы і прыцягненьне да ўдзелу калгаснага актыву забясьпечыла посьпех. Вывазка каменю за першыя тры пяціднеўкі складае 36 проц. месячнага заданьня і загатоўка каменю на полі выкананa на 100 проц.

Узорныя прыклады ажыцьцяўленьня пастановы ЦК КП(б)Б аб месячніку дарожнага будаўніцтва даюць калгасьнікі і алнаасобнікі Брадоўскага сельсавету, Барысаўскага раёну, якія 25-га лютага арганізавалі масавы суботнік па вывазцы каменю і на агульным сходзе пастанавілі даваць кожны дзень для гэтай мэты ня менш 98 фурманак.

Калгасьнікі калгасу «Прагрэс», Жлобінскага сельсавету, Дрысенскага раёну, абвясьцілі сябе ўдарнікамі па выкананьні пляну месячніка і арганізавалі пастаянную брыгаду па вывазцы каменю. Вызначана норма вывазкі для кожнай фурманкі ня менш адзнаго кубометра ў дзень. Калгасьнікі абавязаліся даць на працягу месячніка ня менш адной рацыяналізатарскай прапановы па дарожным будаўніцтве.

У мэтах мабілізацыі грамадзкай думкі калгасьнікі пастанавілі выпускаць кожную пяціднеўку пасьцегазэту «За добрую дарогу». Калгас «Прагрэс» пастанавіў узяць на грамадзкі буксір калгасы «Ленінскі шлях» і імя Красіна, Жлобінскага сельсавету, якія адстаюць, для чаго пасылаюць туды лепшых ударнікаў свайго калгасу. П.

Вынік неарганізаванасьці

ПОЛАЦАК. У Сяляўічынскім сельсавеце, Расонскага раёну, ляжыць пад сьлетам 1.300 куб. каменю. Дарожныя арганізацыі яго толькі пабуравілі, але не ўзарвалі. Сельсаветамі штодня накіроўваюцца фурманкі, але, з прычыны таго, што няма бітага каменю, праца зрываецца. 13-га лютага з вёскі Фядота прыехала па камень— 8 фурманак, але, не знайшоўшы разьбітага каменю, вярнуліся назад улегцы. Галоўны вінаваты ў гэтым—дзесятнік Баранаўскі. З дня абвяшчэньня месячніка штурму ён ня выходзіў некалькі дзён на работу: праз гэта была сарвана праца каля 100 фурманак. Аб гэтым быў складзен акт і пераданы памочніку начальніка Брыкаву, але адпаведнага рэагаваньня з яго боку ня было. У выніку нераспарадчасьці, адсутнасьці апэрацыйнага кіраўніцтва плян работ выкапан толькі на 23 проц.

Брыгада «Зьвязды»:
Сьвірко і Амат. Шустры.

За скажэньне дырэктыў аб цэнах—да адказнасьці

Правяраючая дзяржаўная інспэкцыя цэн пры НК РСІ БССР і менскай інспэкцыяй цэн, пры ўдзеле шырокай грамадзкасьці, масавая праверка цэн на раздробнай сетцы гор. Менску выявіла рад фактаў скажэньня дырэктыў уцэнту і правядзеньні палітыкі цэн (перавышэньне ўстаноўленых цэн, вогтэрск тавараў на пасаданай вазе, невыкананьне пастанову камітэту цэн пры СПА аб вывешваньні прэйс - курантаў і аб адзнацы цэн на таварах (ярлыкі).

Дзяржаўная інспэкцыя цэн пры НК РСІ БССР пастанавіла:

За няправільнае ўстанаўленьне цэн на абутак, мануфактуру і гаспадарчае мыла кулькулятара менскага райсаюзу Мушката аштрафаваць на 100 рублёў.

За няправільнае ўстанаўленьне цэн на масла, алей, макароны, цяцярчыя сухары і чай—бухгальтароў ЗРК абутнікаў Хлебковіча, ЗРК імя Сталіна—Герцыкава, загадчыка спажэньня ЗРК фабрыкі імя Крупскай Рудэрмана аштрафаваць на 25 руб.

За нявывешваньне прэйс - курантаў з адзнакай цэн на тавары намесьніку загадчыка размеркавальніка ЦРК № 6 Сосланду і загадчыку крамы ЦРК № 81—Яцкову вынесьці вымову.

За карыстаньне пасаданай вагой пры вопыту тавараў у краме ЗРК «Вальпынік» загадчыку крамы тав. Кагану вынесьці суровую вымову.

Указаць старшыням праўленьняў менскага райсаюзу тав. Брашнтэйну, ЗРК абутнікаў тав. Кагану, ЗРК імя Сталіна—тав. Рагачэўскаму на непапушчальнасьць перадачы скрадзеных устаноўленых цэн на тавары бухгальтарам, без усякай праверкі і запісаўленасьці з боку праўленьняў.

Усім праўленьням райсаюзу, ЗРК, ЗВК, ЦРК і іншым заклюючым арганізацыям выдучыць на працягу адной дэкады адказнага члена праўленьня, усклаўшы на яго асабістую адказнасьць на правільнасьць устаноўленьня цэн на тавары.

Дарчыць Белкаапсаюзу, Белтаргпо, Белільнакаапсаюзу і іншым арганізацыям раздробнага гандлю неадкладна забясьпечыць выкананьне пастановы камітэту цэн пры СПА аб вывешваньні прэйс - курантаў цэн у раздробнай сетцы і адзначэньні цэн на ярлыках па ўсіх таварах.

ЗА БАЛЬШАВІЦКАЕ АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЕ ПАСТАНОВЫ ЦК УсеКП(б) АБ ШКОЛЕ

Сёньня адбываецца роўна паўгода з дня апублікаваньня гістарычнай пастановы Цэнтральнага Камітэту УсеКП(б) аб пачатковай і сярэдняй школе. Гэтыя 6 месяцаў вяўляюцца парядам шырокай барацьбы за такую школу, якая-б была «ня толькі правадніком прынцыпаў камунізму наогул, але і правадніком ідэйнага арганізацыйнага выхаваўчага ўплыву пралетарыяту на поўпралетарскія і непралетарскія пласты працоўных мас У мэтах выхаваньня пакаленьня, здольнага канчаткова ўстанавіць камунізм» (прадмова УсеКП(б).

Пастановы ЦК УсеКП(б)Б і ЦК КП(б)Б аб школе зьявіліся пачаткам новага перыяду ў карэнным перабудове масавай школы на базе сапраўднага палітэхнізму. Пастановай Цэнтральнага Камітэту нашай партыі дана разгорнутая праграма будаўніцтва агульна-адукацыйнай і палітэхнічнай школы ў перыяд сацыялізму.

Пад кіраўніцтвам партыі, у БССР на гэтым важнейшым вучастку культурнай рэвалюцыі — на вучастку будаўніцтва савецкай палітэхнічнай марксыцка - ленінскай школы, — дасягнуты вялікія посьпехі.

БССР першай з усіх саюзных рэспублік увала і з посьпехам завяршае ўсеагульнае пачатковае навучаньне. У прымежных і прамыслова-індустрыяльных раёнах уводзіцца ўсеагульнае навучаньне дзяцей ва ўзросьце да 17 год. Разгортваецца шырокая сетка дашкольных устаноў, ясьляй, ачагоў.

БССР палічае звыш шасьці з палавою тысяч пачатковых школ. У гэтых школах навучаецца каля 800.000 дзяцей. На 20-га лютага 1932 г. мы маем такі ахоп школьнікаў першага і другога канцэнтру і падросткаў 12-15 год, якія падлягаюць абавязковаму навучаньню. Па першым канцэнтры— 97 проц., па другім канцэнтры — 94,8 проц., падросткаў — 96 проц. У некалькі раз павялічыўся процант школьнікаў і школьніц шаогул у параўнаньні з тым, што мела Беларусь у далёкім, мінулым праўленьнем калгасу, а таксама ці адпавядае колькасьць налічаных працаднёў брыгадзірам кантрольнаму заданьню праўленьня калгасу, як па якасьці, так і па колькасных паказальніках.

5. Пасьля ачэньня праверкі камісія складае ў пісьмовай форме акт, які перадае праўленьню калгасу.

Арганізацыйна-масавыя мерапрыемствы

1. Задача арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў настойліва патрабуе ад калгасных арганізацый стварэньня і выхаваньня калгаснага актыву з ударнікаў-калгасьнікаў. Райсаз, калгасаводы і праўленьні калгасаў павінны весьці сыстэматычную работу па вылучэньні і стварэньні калгаснага актыву. Правесьці дакладны вучот лепшых калгасьнікаў - ударнікаў, правесьці з імі канфэрэнцыі і нарады, пасылаючы лепшых на курсы па павышэньні кваліфікацыі і больш шырока вылучаць на вытворчую і кіруючую работу жанчын калгасьніц.

2. НКЗ і праўленьне Калгасцэнтру БССР абавязае ўсе райсаз і праўленьні

КІТАЙСКІЯ ВОЙСКІ АКАПАЛІСЯ ПАМІЖ НАНСЯНАМ І КІНСЯНАМ

Расправа акупантаў над кітайскім насельніцтвам у Чапэі

Японскія імпэрыялісты падрыхтоўваюць паход супроць кітайскіх саветаў

БЭРЛІН, 4. Паводле паведамленьня левай «Вольт ам абенд» з Шанхаю, японскія войскі ўжо перайшлі 20 клм. нэйтральную зону ў Шанхаі. У многіх вёсках адбываецца жорстка я перастрэлка паміж японскімі і кітайскімі атрадамі. У некаторых месцах кітайскія войскі аказваюць супраціўленьне, набудаваўшы барыкады, з якіх яны адкрылі агонь і прымусілі японцаў адступіць. Сёньня ў пачы ў адной вёсцы японскія атрады адкрылі агонь, цьвердзячы, што стралялі нібы жыхары мястэчка. Пасьля гэтага яны ўварваліся ў дамы, выганялі на вуліцу мужчын, жанчын і нават дзяцей, прыгналі ўсіх у адно месца і расстралялі іх. Мяркуюць, што японцы выкарыстаюць гэтыя інцыдэнты для апраўданьня поступленьня ў глыбіню краіны, нібы з прычыны неабходнасьці пасылкі туды «карных экспэдыцый». Падрыхтоўваецца таксама пасылка карных экспэдыцый супроць кітайскіх савецкіх раёнаў (ТАСС).

Упартыя баі ў раёне Усуна

ШАНХАЙ, 3. Сёньня японцы зьнялі Усун у выніку ўпартых атак, пасьля чаго, як камандаваньне усунскіх фартоў адмовілася выканаць загад Цай Ц'нкая аб эвакуацыі. Японцы пачалі бамбардыроўку фартоў і вёскі Усун з ваенных суднаў. У адказ на бамбардыроўку, кітайскія войскі адкрылі агонь. Японскія гідрапляны скідвалі бомбы вялікай выбуховай сілы. Адначасова японскія атрады прабавалі высадзіцца ў розных месцах. Японскія войскі сустрэлі энэргічнае супраціўленьне, асабліва ў вёсцы Усун, дзе пачаліся пажары. Кітайскія войскі былі, аднак, вымушаны адступіць у напрамку да Люхэ.

Згодна некаторых паведамленьняў кітайскія войскі акапаліся паміж Нансянам і Кінсянам. Паводле непацьверджаных паведамленьняў кітайскія войскі атрымалі падмацаваньні з Нанкіну (войскі пад камандаваньнем Чан Цінвэя і Шан Куэй-юэйна). Сьцьвярджаюць, што калі японцы спрабуюць прасунуцца далей на Захад, дык нанкінскія войскі аказ'ць упартае супраціўленьне разам з чжацянскімі войскамі пад камандаваньнем Лю Ці-піна.

Японцы зьнялі Чапэй і зараз-жа пачалі ў Чапэі вобыскі ў пошуках снайпераў і перапрануты салдат. Пры зьяўленьні японскіх салдатахопленыя вакнай жыхары Чапэю кінуліся з сваіх пэўразбураных памяшканьняў да маста Марихэн, які служыць уваходам на тэрыторыю сэтльмэнту. Да маста тэрмінова прыбыў амэрыканскія маракі, якія разагнані кітайцы бажацаў, заняялі ўвесь мост як з боку сэтльмэнту, так і з боку Чапэю і дапускалі на тэрыторыю сэтльмэнту толькі грузавікі Чырвонага крыжу з параненымі. (ТАСС).

Загад бамбардаваць кітайскія войскі

ТОКІЕ, 4. Паводле вестак шанхайскага карэспандэнта газэты «Асахі» па загаду Усуна адчыўлены вочныя дзеяньні. У результаце дамовленьняў камандзіраў, кітайцы вывудзі ад раёнам Кушканы, аб тым, што кітайскія войскі кавалоць акопы ў Кучкіні і рыхтуюцца да супраціўленьня, Усуна пачалі запраў японскай авіяцыі бамбардзіраць кітайскія войскі ў Кушкане (у 80 клм. ад Шанхаю).

За час шанхайскіх баёў з абодвых бакоў загінула 23 тысячы чалавек

ПАРЫЖ, 4. Як падае шанхайскі карэспандэнт «Нью-Ёрк Таймс», страты бакоў за час шанхайскіх баёў ацэньваюцца ў 23.000 забітых і параненых. Лік-жа загінуўшых у Шанхаі прыватных грамадзян ніколі, паводле гэтага карэспандэнта, ня будзе даведана ўстаноўлена. Матар'яльныя страты, нанесеныя Чапэю і Цзяньнану, вызначаюцца ў 600 млн. кітайскіх даляраў.

Захват амэрыканскай радыёстанцыі

ШАНХАЙ, 4. Японцы выйшлі з Чапэю і заняли Чэнжу. Радыёстанцыя, якая знаходзіцца ў Чанжу і належыць амэрыканцам, занята японскім штабам. Японскі генеральны консул заявіў, што радыёстанцыя будзе асабліва як толькі да гэтага будзе прадстаўлена магчымасьць.

Перапачка паведамленьняў па радыёстанцыі спынена. Японцы не дазваляюць нікому ўваходзіць у Чапэй. Дымы ў радыёсе зьнік трох міль поўнасьцю разбураны.

Некалькі атрадаў салдат ахоўваюць урадавыя будынкі і арсэнал у Лунхуа і вуліцы ў Нандао. У сувязі з чуткамі, што японцы акружуюць Нандао, а таксама з прычыны ваеннага становішча — у Нандао панує паніка.

Чыгуначная станцыя пераапоўнена кітайскімі жыхарамі. Брамы, якія адзяляюць французкую канцэсію ад Нандао, штурмуюцца вялізарным натоўпам народу.

Японія патрабуе ад Кітаю выплаты кантрыбуцыі

ТОКІЕ, 4. Паводле вестак агэнцтва Сімбун Рэнга, міністэрства замежных спраў разьлічвае на хутчэйшае заключэньне канфэрэнцыі «адчуваньня стала» з удзелам ПАЗШ, Англіі і Францыі. Японскі ўрад будзе патрабаваць на канфэрэнцыі адводу кітайскіх войск (яны ўказваючы тэрміну) за лінію, зараз занятую японскімі войскамі, па адлегласьць, якая перавышае раней вызначаныя 20 клм. Нейтральная зона, па думцы японскага ўраду, павінна ахоўвацца міжнародзкай арміяй. Японскі ўрад прад'яўляе патрабаваньне ўплаты рэпарацый за страты, нанесеныя японцамі ў часе ваенных дзеяньняў. На канфэрэнцыі будзе так сама паставлена пытаньне аб антыяпонскім руху і байкоце.

Канфэрэнцыя павінна заняцца выключна шанхайскім «інцыдэнтам».

Калі, аднак, дзяржавы жадаюць — піша агэнцтва Сімбун Рэнга, — «Японія згодна на тое, каб канфэрэнцыя абмяркавала пытаньні, якія адносяцца да становішча сэтльмэнту» (ТАСС).

Абурэньне супроць Нанкінскага ўраду

ШАНХАЙ, 4. Усе кітайскія газэты адпадушна нападаюць на нанкінскі ўрад за тое, што ёй не аказаў падтрымкі 19 армій. З Гаянкоту паведамляюць аб вялікім абурэньні ў Кантоне, дзе заяўляюць, што «адступленьне 19 армії выклікана выключна адсутнасьцю падтрымкі з боку Нанкіну». Сярод кантонскага насельніцтва праводзяцца трапезныя зборы на ваенныя патрэбы.

Францыя адпраўляе войск на Далёкі Усход

ПАРЫЖ, 26. «Юманітэ» падае карэспанданцыю з Мангобан, у якой гаворыцца, што 16-ты полк сэнэгальскіх стралкоў рыхтуецца да адпраўкі на Далёкі Усход. Новы камандзір 10-га пяхотнага палка сказаў перад салдатамі палкую прамову, у якой заявіў, што ў «лінеі 1914 году мы ня былі так блізка да вайны, як зараз». Бранявосец «Прымаго» рыхтуецца да адплыцьця ў Кітай. На борце карабля знаходзіцца адмірал Бэртэло, назначаны камандуючым ваенна-марскімі сіламі Францыі на Далёкім Усходзе (ТАСС).

Эканамічны крызіс у Японіі паглыбляецца

ТОКІЕ, 3. З пачатку году пасыў японскага гандлю складае нябывалую для гэтага перыяду году суму — у 94 млн. ін супроць 5 млн. ін у мінулым годзе. Пасыў выклікан узмацненьнем пакупкі бавоўны і скарачэньнем экспарту, які працягваецца. Асацыяцыя тэкстыльных прадпрыемцаў захвала скарачэньне прадукцыі бавоўняна-папяровых тканін у разьмеры 31,4 проц. яшчэ на 3 месяцы.

На фінансавым рынку напружанае становішча, якое выклікаецца адлівам укладаў з банкаў, а таксама адлівам капіталу з Японіі. Курсы цэнных папер на біржах падаюць далей, на гледзячы на паведамленьні аб перамогах у Шанхаі. Ажыўленьне наглядаецца толькі ў параходстве, у хімічнай прамысловасьці, а таксама ў вядомай частцы цяжкай прамысловасьці, якая атрымлівае ўрадавыя заказы у сувязі з ваеннымі дзеяньнямі.

Конкурс спараных брыгад

Масавымі мітынгамі адзначылі чыгуначнікі дзень старта

Двухтысячны мітынг на ст. Магілеў

29 лютага на станцыі Магілеў адбыўся 2-х тысячны мітынг, прысьвечаны старту лепшым паравозьнікам—удзельнікам усесаюзнага і раённага конкурсаў. З паравозу № 613 машыніст т. ІСАЕЎ удзельнік конкурсу запэўніў, што будзе па-бальшавіцку змагацца за выкананьне 12 умоў конкурсу. Тав. Ісаеў мае 40-гадовы вытворчы стаж. Ён апраўдае надзеі рабочых чыгуначнага вузла.

Разам з т. Ісаевым у спаборніцтва ўступілі лепшыя рабочыя Магілеўскага вузла. На вытворчым вечары, які адбыўся 28 лютага, такары дэпо т.т. МАРТЫНАЎ, ГІЛЯСАЎ, ЖУРАЎЛЁЎ, КАВАЛЬ НАВІЧОНАК і інш. абавязаліся поўнасьцю рэалізаваць 6 умоў т. Сталіна. На аснове рэалізацыі іх, яны далі абяцаньне зьнішчыць паўторнасьць рамонту, узьняць прадукцыйнасьць працы на 10 проц., знізіць сабекошт на 7 проц., прымаць актыўны ўдзел у грамадзкай рабоце і г. д.

Брыгады паравозьнікаў Ціхенка, Міткалёва, Яжэнка і інш. узялі на сябе абавязацельствы павялічыць нарысную работу паравозаў на менш чым на адну гадзіну, перавыконаць нормы прабегу паравозаў, строга прытрымлівацца графіку, эканоміць апалу на менш чым на 15 проц., на 100 проц. замацаваць спараную і г. д.

Работнікі станцыі таксама ўключыліся ў сацспаборніцтва па арганізацыі выразнай апрацыйнай работы. Работнікі шляху абавязаліся дабіцца поўнай ліквідацыі затрыманьня цягнікоў па іх віне. На гэтым вытворчым вечары было заключана 101 ДАГАВОР НА САЦСПАБОРНІЦТВА ПАМІЖ МАШЫНІСТАМІ, 80 ПАМІЖ СЬЛЕСАРАМІ, 16—ДЗЯЖУРНЫМІ ПА ДЭПО І 40—СЯРОД РАБОТНІКАЎ ІНШЫХ СЛУЖБ.

Задача партарганізацыі вузла заключаецца ў тым, каб стаяць на чале творчай актыўнасьці рабочых вузла і накіроўваць яе на барацьбу за пяршынства. Кожны дзень спаборніцтва павінен прынесьці новыя дасягненьні ў рабоце як паравознага парку, так і ўсіх служб вузла.

Брыгада друку:
АСТАСЕНКА І Н. ТУЛІЦКІ.

Уступілі ў барацьбу за пяршынства

ЖЛОБІН. 3-II.

ДАН СТАРТ УДЗЕЛЬНІКАМ УСЕСАЮЗНАГА КОНКУРСУ. ПРЫ АДПРАЎЦЫ ЦЯГНІКА З ПАРАВОЗАМ № 557, ЯКІ ПРЫМАЕ ЎДЗЕЛ ВА УСЕСАЮЗНЫМ КОНКУРСЕ, АДБЫЎСЯ МІТЫНГ ЎДАРНІКАЎ ВУЗЛА, НА ЯКІМ ПРЫМАЛА ЎДЗЕЛ КАЛЯ 1.600 ЧАЛАВЕК. ПАРАВОЗ № 557 ПРЫПІОЎ ДА МЕСЦА ПРЫЗНАЧЭНЬНЯ—У КАЛІНКАВІЧЫ—НА 7 МІНУТ РАНЕЙ ВЫЗНАЧАНАГА ЧАСУ ПАВОДЛЕ РАСКЛАДУ.

РАЗАМ З ПАРАВОЗАМ № 557 У СПАБОРНІЦТВА ЎСТУПІЛІ УСЕ ПАРАВОЗЬНІКІ ЖЛОБІНСКАГА ВУЗЛА, А ТАКСАМА РАБОТНІКІ СТАНЦЫІ ЖЛОБІН. СЯРОД ЧЫГУНАЧНІКАЎ НА ГЛЯДАЕЦЦА ВЯЛІКІ ЎЗДЫМ, ІМКНЭНЬНЕ ЗАВАЯВАЦЬ ПЯРШЫНСТВА ПА ЎСЕСАЮЗНЫМ КОНКУРСЕ.

Я. М. С.



Паравоз Жлобінскага дэпо Щ-557 машыніста Аднаслюдава ў старта

Усім ГК і РК КП(б)Б, рэдакцыям раённых і шматтыражных газэт БССР

На працягу 10-25 сакавіка 1932 году па ўсіх гарадах і раёнах БССР неабходна правесьці чарговыя масавыя нарады рабселькораў.

Парадак дня сярод рэшца наступны: 1) Чарговыя задачы нізавога друку ў падрыхтоўцы да веснавой пасеўнай кампаніі, ход работы на конкурсе «Правды» і аб спаборніцтве з друкам УССР і Паўночнага Каўказу.

а) Судаклад на гэту тэму рэдкалегій адной-дзьвёх пасьцёных газэт аб канкрэтна праробленай рабоце; 2) задачы нізавога друку ў барацьбе за марксыцка-ленінскае выхаваньне: а) судаклад на гэту тэму рэдкалегій адной-дзьвёх пасьцёных газэт аб канкрэтна праробленай рабоце.

У першым пункце нарадзе ня павінна быць абмежавана выкладзена пытаньне барацьбы селькораў за сэкрэтарыяе земельных і страхавых фондаў.

На нарадах, якія будуць абгаворваць рабкораў прадпрыемстваў, неабходна яшчэ дадаткова разгорнута прапрацаваць пытаньне аб далейшым плане канкрэтнага ўдзелу ў абвешчаным усебеларускім сталінскім паходзе спаборніцтва фабрычна - заводзкага нізавога друку.

Культпроп ЦК КП(б)Б падкрэсьлівае, што нарады рабселькораў трэба склікаць не агульныя, а куставыя і абавязкова спэцыялізаваныя (асобна рабселькораў ільнаводчых калгасаў і саўгасаў, асобна — жывёлагадоўчых, асобна рабкораў мэталёвай прамысловасьці, асобна — швэйнай і г. д.). Выключна завостраную ўвагу трэба аддаць грунтоўнай папярэдняй падрыхтоўцы да нарад рабселькораў, а таксама да шырокага прыцягненьня да нарады спэцыялістаў, гаспадарнікаў, прафработнікаў і праўленьняў калгасаў.

У пастановах нарад трэба вызначыць канкрэтныя мерапрыемствы па забесьпячэньні практычных вынікаў сацыялістычнага спаборніцтва друку і рабселькораў БССР з друкам і рабселькорамі УССР і Паўночнага Каўказу на лепшую работу па арганізацыйна - гаспадарчым умацаваньні калгасаў і падрыхтоўцы да веснавой слуфбы (давесьці спаборніцтва да кожнага калгасу, саўгасу, МТС, разгарнуць спаборніцтва ўнутры кожнага калгасу, саўгасу, МТС, непасрэдна зьвязаўшы з поўнымі калгасамі УССР, Паўночнага Каўказу і г. д.).

Рэдакцыі газэты «Рабселькор» вынесьці пытаньне в мапар'ялнае і шматлюдны нарадзе рабселькораў.

У аснову ўсёй работы на падрыхтоўцы і правядзеньні нарад рабселькораў павінны быць пакладзены пастановы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб веснавой слуфбе, пастанова ЦК УсеКП(б) ад 4-га лютага 1932 г. — «Аб чарговых мерапрыемствах па арганізацыйна - гаспадарчым умацаваньні калгасаў», і пастановы СНК СССР і ЦК УсеКП(б) аб абоpы калгасных насенных фондаў на СССР.

Уся работа як па падрыхтоўцы, так і на непасрэдным правядзеньні нарад рабселькораў павінна быць цалкам падпарадкавана павышэньню ролі нізавога друку, як актыўнага правадніка генэральнай лініі партыі, у барацьбе за бальшавіцкую падрыхтоўку да веснавой слуфбы, арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, у барацьбе на два фронты, супроць правага ўхілу — галоўнай небяспекі на даным этапе, супроць «левых» загібаў і прыміраючых адносін да ўхілаў.

Падрыхтоўцы нарадаў і самае правядзеньне куставых сельскіх нарад павінна быць аканчана яшчэ больш узмоцненай, пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый, барацьбой селькораў за зьмяцьненьне стварэньня калгасных насенных фондаў, за фасторэтую і сьвяцкоўную падрыхтоўку да веснавой слуфбы.

Нам. загадчыка Культпропу ЦК КП(б)Б —
ЗАЛАТУХІН.

Загадчык сэктарам друку Культпропу ЦК КП(б)Б —
КУРЦІК.

Адкрыўся ўсебеларускі агра-зоатэхнічны зьезд

Учора ў актавай залі БДУ адкрыўся ўсебеларускі агра-зоатэхнічны зьезд.

Нарканзем БССР тав. Рачыцкі ў сваёй уступнай прамове пры адкрыцьці зьезду адзначыў, што першы аграмэнічны ўсебеларускі зьезд адбываўся ў 1929 годзе. Цяперашні зьезд як па сваіх задачах, так і па складзе ўдзельнікаў каронным чынам адрозьніваецца ад першага зьезду.

За гэты час, — падкрэсьліў тав. Рачыцкі, — у нашай краіне адбыліся вялізарныя клясавыя, сацыяльна-эканамічныя зрухі. Рабочая класа, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, дасягнула вялізарных перамог у справе сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі.

Калгасы, саўгасы і МТС даюць магчымасьць зусім па-новаму паставіць пытаньне ўзьняцьця ўраджайнасьці і па-новаму іх вырашыць.

Наш зьезд адрозьніваецца ад першага зьезду яшчэ і тым, што ў ім прымаюць удзел практыкі сацыялістычнага тыпу гаспадаркі — спэцыялісты, ударнікі саўгасаў і МТС, ударнікі-калгасьнікі.

У прэзыдыум зьезду абрана 53 чалавекі, у тым ліку т. т. Гікало, Шаранговіч, Галадзед, Жыбуроўскі, Рыскін, Іванаў, Чарняжоў, Рыжкоў, Кавальчук, Рачыцкі, Міцькоў і інш.

У ганарэны прэзыдыум зьезду абраны палітбюро ЦК УсеКП(б), т. т. Рудзутак, Якаўлеў, Ленскі і Тэльман.

Апошнія весткі з фронту індустрыялізацыі

На Надзеждзінскім заводзе задута новая домна

СЬВЯРДЛОЎСК. 2 сакавіка ў 8 гадзін вечара на Надзеждзінскім заводзе задута домна № 1. Заваліка шахты праведзена здавальняюча, домна пачала працаваць нармальна. На сваёй продукцыйнасьці домна № 1 выйшла самай вялікай з усіх домнаў заводу.

500 магутных паравозаў у год

НОВАСІБІРСК. У Кузьнецку, побач з мэталюргічным камбінатам, пачнецца ў гэтым годзе будаўніцтва магутнага паравозабудаўнічага заводу. Завод будзе выпускаць у год 500 паравозаў, сэрыі 1-5-1 і 25 тыс. тон запасных частак. Газавая прадукцыя заводу запраектавана ў 100 млн. руб.

На рашаючых вучастках

ВУГАЛЬ. 2 сакавіка па Саюзе здабыта 189.167 тон вугалю.

3 сакавіка па Данбасе здабыта 133.890 тон вугалю.

МЭТАЛЬ. 1 сакавіка па ўсіх мэталюргічных заводах Саюзу выплаўлена 14.894 тоны чыгуну і 15.227 тон сталі.

Скура

За шостую пяцігодку лютага Магілёўская гарбарня імя Сталіна выпусьціла прадукцыі на 99.221 руб., што складае 147,35 проц. заданьня.

Сельгасмашыны

ЗАВОД ГОМСЕЛЬМАШ выканаў вытворчую праграму за люты месяц на 107,2 проц. апэрацыйнага плану. Прычым, праграма на сілосарэзках выканана на 104 проц. — выпрацавана 774 сілосарэзкі; па сячкарнях — на 116.4 проц. — 476 сячкарань па бульбасартоўках — на 116,7 проц. — 467 бульбасартовак і па капцэпшнасартоўках на 100 проц.—80 капцэпшнасартовак.

Квартальны плян выканан на ўсіх відах прадукцыі на 57 проц.

2 сакавіка заводам выпушчана 35 сілосарэзак — 152,1 проц., 18 сячкарань — 138,4 проц., 20 бульбасартовак — 117,6 проц. і 6 капцэпшнасартовак — 171,4 проц.

Будматар'ялы

ЦЬВІКІ. 3-та сакавіка пратацьвікоўны завод «Чырвоны кастрычнік» (Ворша) выпрацаваў 4.080 кубм. будаўнічых цьвікоў, або 61,8 проц. заданьня. Неканькасанальнае плану тлумачыцца адсутнасьцю цынкутага дроту.

2 сакавіка Рэчыцкі завод «Інтэрнацыянал» выпусьціў 822,8 сярэдніх цьвікоў, што складае 88,16 проц. заданьня і 2.346 сот шруба ў — 97,75 проц. плану.

Адказны рэдактар М. ГАРЫН.

Паведамленьні

— 7 сакавіка, у 12 гадз., у культпропе ЦК КП(б)Б (пакой № 16) выклікаецца загадчыкі культпропаў усіх ЦП саюзаў, праданаўнік БАН, тав. Слонім — гіст. прамысловасьці, тав. Галін — гіст. рэканструкцыі с.-г. Леніна, тав. Гурко — выкладчык-экзаменатар гіст., — па пытаньні аб падрыхтоўцы да веснавой слуфбы. Яўка абавязковая і без спазьненьня.

— Культпроп ЦК КП(б)Б прапануе сакратарам партыйных і камсамольскіх арганізацый тых прадпрыемстваў і устаноў, у якіх працуюць студэнты, якія ў сінежні 1931 г., скончылі рабфак БДУ і павінны былі 1-га лютага выехаць на вучобу у ВПІ і БДУ, але да гэтага часу не выехалі, чым зрываюць указаньні ЗЦВК аб набору ВПІ і БДУ, а таксама планавую падрыхтоўку падкадраў, — асабліва ад прадпрыемстваў і з установаў і ў 2-дзённы тэрмін накіраваць у распаряджэньне рэктара БДУ. Мен. гарЛКРСІ просьба ў 2-дзённы тэрмін правесьці выканальнае гэтага распараджэньня.

Нам. заг. культпропу ЦК КП(б)Б
ЗАЛАТУХІН.

7-га сакавіка г. г., у 7 гадзін вечара, у памяшканьні ДОМУ КАМАСЬВЕТЫ (рог вул. Энгельса і Карла Маркса)

скліканага

пленум менскага гарадзкога камітэту КП(б)Б

сумесна з парт., праф., савецкім актывам і дэлегатамі.

ПАРАДАК ДНЯ:

Даклад аб Міжнародным Жаночым Камуністычным Дні 8-га сакавіка.

Члены і кандыдаты ЦК і ЦКК КП(б)Б, члены і кандыдаты ГК КП(б)Б і Гор. КК КП(б)Б праходзяць па пленум па сваіх мандатах.

Білеты на права ўваходу на пленум для парт., праф. і сав. актыву і дэлегатаў—сакратаром калектываў і ячэек КП(б)Б неабходна атрымаць у гаркоме КП(б)Б (пакой № 10) 5 і 7-га сакавіка з 10-ці гадз. раніцы да 4-х гадз. дня.

У сувязі са скліканьнем пленуму гаркому, партыйны дзень з 7 сакавіка пераносіцца на 9 сакавіка.

Сакратар Менгаркому КП(б)Б КАВАЛЬЧУК.

Да ведама ўсіх ФЗК, МК ГК і рабачкомаў г. Менску.

2-гі Менскі гарадзкі зьезд прафсаюзаў

скліканага 8-га сакавіка, у 6 гадз. веч., у памяшканьні клюбу мэталістаў (Універсытэцкая, вул.).

ПАРАДАК ДНЯ:

1) Даклад ЦСПСБ. 2) Справаздача ГСПС (т. Шулькін). 3) Справаздача рэв. комісіі (т. Варончанка). 4) Народна-гаспадарчы плян на 1932 г. (т. Валодзьна). 5) Рабочае забесьпячэньне і становішча прыгарадзкіх гаспадарак (т. т. Гантман і Шлейфар). 6) Справаздача гарспраўкамітэту (т. Гнедзько). 7) Выбары.

Выбары дэлегатаў прадпрыемстваў, выхадзячы з модусу 1 ад 300 чл. саюзу, прычым прадпрыемствы, набудовы і саўгасы выбіраюць самастойна (прадпрыемствы, набудовы і саўгасы, якія налічваюць менш 300 чл. саюзу, выбіраюць таксама адзнаго дэлегата), а ўстановы і іншыя арганізацыі, якія налічваюць менш 100 чл. саюзу, выбіраюць на агульных сходах або канфэрэнцыях па саюзнай лініі.

Выбары павінны быць скончаны да 5 сакавіка.

Выдача мандатаў пачнецца з 5 сакавіка штодзенна ў памяшк. ГСПС з 10 сад. раніцы да 8 гадз. вечара.

Па ўсіх пытаньнях, зьвязаных з правядзеньнем гарадзкога зьезду зварачацца у ГСПС па тэл. №№ 8-70 і 16-41.

ГАРПРАФСАВЕТ.

Чырвоная Зорка — Заменены фільм „ТЭМБІ" (драмэнія Афрыканскіх джунгляў)

ПРАЛЕТАРЫ — Мастацкі фільм ЧАЛАВЕК З МЯСТЭЧКА

СПАРТАК — ЧАЙНА ЧАЮ КАМЭДЫЯЎ 6, ч. Апош. праграма. Кіно нятая ў 2 ч.

З 1-га красавіка пры Беларускім ДЭРЖАЎНЫМ ВЫШЭЙШЫМ ПЭДАГАГІЧНЫМ ІНСТЫТУЦЕ адкрываюцца КУРСЫ

па падрыхтоўцы да асенняга набору ў ВПІ. Пэдінстытут. Пры курсах будзе вэрэйская адукаваньне на 60 асоб.

На курсы прымаюцца рабочыя, іх дзеці, калгасьнікі і служачыя, якія маюць асьвету ня ніжэй 7-годзі.

ЗЯЛЯВЫ прымаюцца ў канцылярыі інстытуту (Менск, Універсытэцкі гарадок, Галоўны корпус пакой № 2-31) да 25 сакавіка г. г.

Стыпэндыяльныя і інтэрнатныя курсанты не забясьпечваюцца.

Дырэктар ВПІ
В. Рудніцкі.

ІКІО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ"

СЁНЬНЯ І ШТОДЗЕННА

МАСТАЦКІ ФІЛЬМ

МЕСЯЦ ЗЬЛЕВА

У галоўн. ролі ЗОЯ ВАЛЕЎСКАЯ.

Пры Гомельскім агра-пэдінстытуце адкрываецца ЗАВОЧНЫ СЭКТАР

у складзе 2-х аддзяленьняў:

хэміка-біялёгічнага і фізіка-тэхнічнага.

Тэрмін навучаньня—2 гады.

Прыём заяў прапагаецца да 1-IV—32 г. Пры заявах павінны быць прыкладзены дакументы, неабходныя для паступленьня ў ВНУ.

Першыя заданьні завочнікам будуць рассылацца інстытутам з 1-IV.

Дакументы накіроўваць на наступны адрас: Гомель, агрпэдінстытут, завочны сэктар.

Дырэктар Стешаўскі.

10 сакавіка, роўна ў 11 гадзін раніцы ў гор. МАЗЫРЫ у памяшканьні малой залі гарадзкога тэатру

АДКРЫВАЕЦЦА

пашыранае аб'яднаўчае пасяджэньне

цэнтральнай (вызнаной) і раённай конкурсных камісій па кіраўніцтве конкурсам нізавых газэт саўгасаў, калгасаў і МТС на лепшую работу па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў.

НА ПАРАДКУ ДНЯ:

Даклад аб рабоце па конкурсе

а) раённых газэт „Калгасьнік Магілёўшчыны", „Калгасьнік Пятрыкоўшчыны", „Бальшавіцкі змагар" (Ельск), „Прыменны вакуар" (Жыцьвавічы);

б) рэдактароў насьцённых газэт (Мазырскага раёну): саўгасаў „Сьвабода" і „Молатавец", калгасаў „Н. Калодзінкі" і „Варашылаўка" (Бабруйскага сельсавету);

в) даклад старшыні Слабадзкога сельсав. даклад старшыні раёнагазэтасаюзу, старшыні раённасоюзу і сакратара Юраўцкай ячэйкі ЛКСМБ.

Для ўдзелу ў пасяджэньні запрашаюцца: партыйны, прафсаюзны, камсамольскі і калгасны актыў, рэдактары насьцённых і рабселькоры.

Цэнтральная конкурсная камісія пры „ЗЬВЯЗЬДЗЕ".

ПАШЫРАНАЕ ПАСЯДЖЭНЬНЕ ПРЭЗЫДЫУМУ ЦК МОПР'у БССР

АДБУДЗЕЦЦА

6 сакавіка, у 7 гадзін вечара ў памяшк. ЦК МОПР.

ПАРАДАК ДНЯ:

1) Дадатковыя мерапрыемствы па правядзеньні дня МОПР'у—18 сакавіка.

2) Інфармацыя аб ходзе пазыкавай кампаніі.

3) Зацьвярджэньне плану работы на 1932 г.

4) Аб выпуску курсантаў Інтэрфаку.

Яўка ўсіх членаў і кандыдатаў ЦК абавязкова.

Запрашаецца гарадзкі актыў.

Сакратар ЦК МОПР БССР Цудзін.

Пралетары чырвонага Менску патрабуюць вызваленьня ахвяр клясавага суда

Рукі прэч ад 8 папоньнікаў капіталу

Заслухаўшы паведамленьне аб падрыхтоўцы кары сьмерцю над 8 маладымі нягрыцянскімі рабочымі ў Скатсборы — агульны сход навуковых, тэхнічных працаўнікоў і вэльпірантаў БАН рашуча пратэстуе супроць падрыхтоўкі гэтай зьвярэкай расправы амэрыканскай буржуазіі над лепшымі прадстаўнікамі рабочай клясы.

Мы патрабуем вызваленьня засуджаных і заклікаем рабочых, працоўнае сялянства і працоўную інтэлігенцыю ўсяго сьвету ўзьняць голас пратэсту супроць пакаранья сьмерцю 8 нявінных рабочых. Мы заклікаем працоўных яшчэ шчыльней згуртавацца вакол камуністычнай партыі і Камінтэрну для ажэсткай і рашучай барацьбы з капіталам за сусьветную пралетарскую рэвалюцыю.

З свайго боку мы яшчэ больш напружым сілы на выкананьне і перавыкананьне вытворчых пляноў акадэміі, па дапамогу падпорным калгасам у іх арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні, на выкананьне пляноў веснавой слуфбы.

На тэрор буржуазіі мы адказваем 100 проц. уступленьнем у рады МОПР'у.

Для дапамогі палітвязьням у капіталістычных турмах і іх сем'ям, сход пастанавіў адлічыць 1 проц. месячнага заработку.

Рукі прэч ад 8 палоньнікаў капіталу! Прэч капіталістычных катаў!

Нехай жыве салідарнасьць рабочых і працоўных сялян усяго сьвету!

* * *

Аб'яднаны сход супрацоўнікаў Белпесграму, Лесбелу, Белдрэва і Лесаснабсбыту пратэстуе супроць падрыхтоўкі кары сьмерцю на электрычным крэсьле над 8 нягрыцянскімі маладымі рабочымі.

На выверкі прысуд агульны сход адказае адлічэньнем 1 проц. месячнага заработку, а таксама абавязваецца выкананць і перавыкананць прамфінплян і дапамагчы найшэфным калгасам з посьпехам правесьці веснавую слуфбу.

* * *

Агульны сход рабочых заводу стандартных дамоў № 1 пратэстуе супроць белага тэрору, які пануе ў ПАЗШ.

У знак брацкай пралетарскай салідарнасьці з ахвярамі фашысцкага тэрору, на дапамогу палітзьняволеных рабочых заводу адлічаць паўдзённы заработак. Сход выклікае пасьледаваць яго прыкладу Менбуд, Белдзяржбуд і 4-ты групком.

* * *

Студэнты і выкладчыкі Менскага гідратэхнікуму в абуренным пратэстуюць супроць зьвярэкай расправы амэрыканскай буржуазіі над 8 маладымі рэвалюцыянэрамі-нэграмі.

У адказ на тэрор, на прысуд кары сьмерцю над маладымі рабочымі-нэграмі, студэнты уносяць у фонд МОПР'у 70 руб.

Апрача гэтага, рэзалюцыі пратэсту супроць зьвярэкай клясавай расправы амэрыканскай буржуазіі над маладымі рабочымі-нэграмі атрымалі яшчэ ад студэнтаў і служачых Менскага Белпэдтэхнікуму і пэдкурсаў, ад заводзкай канфэрэнцыі МОПР'у Менмясакомбінату, ад рабочых, адміністрацыйна - тэхнічнага пэрсаналу і служачых вагона-рамонтнага заводу «Полымя рэвалюцыі», ад агульнага сходу рабочых, ІТР і служачых Менбуду і ад агульнага сходу рабочых і служачых Вадаканалтрэсту.

Паведамленьне ТАСС

5 сакавіка ў 2 гадзіны 10 мінут дня на рагу Леонтьеўскага завулку і вуліцы Герцэна быў зроблен замах на дарадцу германскага пасольства пана Твардоўскага, які ехаў з пасольства дадому.

Злачынца зрабіў некалькі стрэлаў з рэвальвэру і нанёс п. Твардоўскаму ізьве раны — адну невялікую на шыі і параненьне кісьці левай рукі з пераломам касьці. Пасьпеўшымі супрацоўнікамі АДПУ страляўшы быў абязброен і арыштован. Затрыманы назваў сябе Іудай Міронавічам Штэрнам. Сьледзтва праводзіцца АДПУ прысьпешаным парадкам.

Пан Твардоўскі праехаў з месца замаху у Крамлёўскую больніцу, дзе яму аказана неадкладная дапамога.

Зараз-жа па атрыманьні паведамленьня аб замаху нам. народнага камісара па замежных справах т. Крэсьцінскі і загадчык аддзелам Цэнтральнай Эўропы прыбылі ў больніцу і выказалі спачуваньне германскаму паслу Дзіркзену, які там знаходзіўся, і самому п. Твардоўскаму.

Выпуск новай выйгрышнай пазыкі 1932 году

ЦВК і СНК СССР пастанавілі выпусьціць УНУТРАНУЮ ВЫЙГРЫШНУЮ ПАЗЫКУ 1932 г., тэрмінам на 10 год з 1-га красавіка, НА СУМУ У 50 МЛН. РУБЛЁЎ, у аблігацыях вартасьцю 100 руб. Падпісная аблігацыя складаецца з чатырох частак па 25 руб.

Аблігацыі пазыкі могуць свабодна прадавацца і закладвацца без якіх-небудзь абмежаваньняў. Аблігацыя, на якую прыпаў выйгрыш, пагашаецца і выключаецца з дапэйшых тыражоў выйгрышаў.

Намінальны кошт выйгрышаў аблігацыі ўключаецца ў суму прыпадушага на яе выйгрышу.

ВЫЙГРЫШЫ УСТАНАЎЛЯЮЦЦА АДЗІН У 25.000, ПЯЦЬ ПА 10.000, ДЗЕСЯЦЬ — ПА 5.000, ПЯЦЬДЗЕСЯТ —ПА 1.000, СТО ПА — 500 І СЕМСОТ ПЯЦЬДЗЕСЯТ ДЗЕВЯЦЬ — ПА 300.

ТЫРАЖЫ АДБЫВАЮЦЦА ШТОМЕСЯЧНА КОЖНАГА 16 ЧЫСЛА З 15-ГА МАЯ 1932 ГОДУ.

Праца БДТ-III у Віцебску

Беларускі Дзяржаўны Тэатр, пад кіраўніцтвам народнага актора Галубка, да адкрыцьця сэзону ў Віцебску шырока разгарнуў падрыхтоўчую работу на фабрыках, заводах і сярод вырвонармейцаў. Да сьвяткаваньня XIV гадавіны